Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 473. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-5 да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.

Змена адрасу: інтэгародзкія — 20 к., сяосныя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок шапіраго ліцьля тэксту — р. 50 к.
За радок шапіраго ітэкрог тэксту 1 р. — к.
За радок шапіраго перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьвешныя на 50 проц. дарожэй.
Зным тарыфу бярэцца 10 проц. ніязгу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 радок . . . 35 кап.
За кожны дадатковы . . . 15 „
Беспрацоўных і чырвонаармейцаў за радок . . . 15 „
За кожны дадатковы . . . 5 „
Публікацыі ЗАГСу—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 58 (2246) Чацьвер, 8-га сакавіка 1923 г.

Гра некаторыя задачы па ўзьняцьцю палітычнага і культурнага ўзроўню жанчыны.

Міжнародны Жаночы Дзень у капіталістычных краёх ёсьць дзень падліку рэвалюцыйных сіл жаночага пралетарыяту. У Савецкім Саюзе, дзе зьнішчана эксплёатацыя рабочае клясы капіталістамі, дзе зьнішчана пазаўсёды панаваньне буржуазеі і абшарнікаў, дзе, разам з тым, зьнішчана ўсякая няроўнасьць перад законам, Міжнародны Жаночы Дзень ёсьць дзень падліку нашых дасягненьняў у спрэве вызваленьня жанчыны, ёсьць дзень намечаньня далейшых задач па ўзьняцьці культурнага і палітычнага ўзроўню работніц і сялянак, на стварэньню фактычнага роўнапраўя жанчыны—работніцы і сялянкі з мужчынскаю часткаю насельніцтва. Пры савецкай уладзе ў працы па канчатковаму і поўнаму вызваленьню жанчыны няма ніякіх іншых задач, апроч задачы ўзьняцьця яе культурнага і палітычнага ўзроўню, апроч задачы стварэньня матар'яльных прадпасылак для зьнішчэньня гістарычнай створанай адсталасьці і няроўнапраўя работніцы і сялянкі.

Паласа культурнай рэвалюцыі, у якую мы ўвайшлі, павінна даць магутны ўздым усёй жаночай масы, усім работніцам і сялянкам, на больш высокі культурны і палітычны ўзровень. Паласа культурнай рэвалюцыі павінна канчаткова зьнішчыць адвечныя перажыткі няроўнапраўя паміж жанчынай і мужчынай у быце. У гэтай справе наша партыя, савецкая дзяржава і ўся савецкая грамадзкасьць павінны выявіць вялікую актыўнасьць і садзейнічаньне шырокіх мас работніц і сялянак. Няроўнасьць, створаная вякамі, ня можа быць зьнішчана простым законадаўчым актам. Пад зьнішчэньнем яе ўсім працаўнікам савецкай дзяржавы трэба гады працаваць.

У бліжэйшы час нам трэба, перш за ўсё, зьвярнуць сваю ўвагу на наступнае:

1) Калі ўцягваньне жанчыны ў фабрычную вытворчасьць пры панаваньні капіталу мела сваёй мэтай толькі павялічэньне прыбыткаў капіталу шляхам павялічэньня эксплёатацыі рабочай клясы, выкарыстаньне больш таннай і менш арганізаванай жаночай рабочай сілы, дык пры савецкай уладзе, прыйсцей[illegible] зроўную працу, пры ўсямернай абароне жаночай працы савецкай дзяржавай, уцягваньне жанчыны ў вытворчасьць мае сваёй мэтай толькі вызваленьне яе ад рэшткаў дапатопнага патрыархальнага быту і ўстанаўленьне яе поўнага эканамічнага і бытавога роўнапраўя. Тое, што на нашых фабрыках і заводах на адзінаццатым годзе рэвалюцыі работніцы займаюць усё яшчэ нізначнае месца, сьведчыць толькі аб нашай адсталасьці, аб моцы бытавых перажыткаў патрыархальшчыны. Нязначны ўдзел жанчын у фабрычна-заводзкім прадпрыёмстве зьяўляецца найбольшай перашкодай да ўзьняцьця яе культурна-палітычнага ўзроўню, да стварэньня новых вольных узаемаадносін між мужчынаю і жанчынаю, вялікай перашкодай да камуністычнага выхаваньня будучага пакаленьня. Наша партыя і савецкая дзяржава павінны ўжыць усе захады да таго, каб, адначасова з далейшым ростам пралетарскіх кадраў нашай краіны, яшчэ больш хутка расла жаночая частка пралетарыяту, каб гэтым самым эканамічна перамагчы стэрую патрыархальную сям'ю і стары быт. У гэтай справе неабходна сур'ёзная дапамога ўсёй рабочай клясы. Неабходна рашуча выступіць супроць асобных адсталых рабочых, якія перашкаджаюць уцягваньню жанчыны ў вытворчасьць, якія сьмяюцца яшчэ над нявопытнай жаночай работніцай на кваліфікаванай працы.

2) Сялянскі двор у яго сучасным выглядзе склаўся шмат вякоў таму назад пры падзяволеньні сялян. У сялянскім двары да савецкай улады жанчына-сялянка была толькі рабочай сілай. Пры савецкай уладзе, уцягваючы сялянскі двор усё больш і больш у сфэру дзяржаўнага савецкага ўплыву, трэба дамагацца зьнішчэньня старых перажыткаў падзяволеньня, трэба дамагацца фактычнага роўнапраўя жанчыны і мужчыны ў прадстаўніцтве інтарэсаў двара. Гэта ёсьць, між іншым, шлях да зьмены патрыархальнага характару самога сялянскага двара. Трэба дамагацца, каб па тых галінах працы, у якіх занята пераважна сялянка, яна зьяўлялася пераважным прадстаўніком сялянскага двара у савецкай грамадзкасьці, у каапэрацыі, перад дзяржавай і г. д.

Гэта вельмі цяжкая задача, да вырашэньня якой пры нашай адсталасьці і малакультурнасьці ёсьць шмат перашкод, але якая павінна быць вырашана абавязкова.

3) Савецкае законадаўства прызнае поўнае роўнапраўе жанчын у палітычным і грамадзкім жыцьці. Аднак, работніца і сялянка пры выбарах у саветы, каапэрацыю і г. д. усё яшчэ ўдзельнічае ў значна меншай ступені, чым мужчына. Гэта тлумачыцца, з аднаго боку, створанымі здаўна звычаямі, з другога боку, большым замацаваньнем жанчыны і да гэтага часу пры двары, чым мужчыны. Нам трэба павесьці рашучую барацьбу з палітычнай пасыўнасьцю жаночай масы. Нам трэба павесьці яшчэ большую барацьбу, чым да гэтага часу, супроць палітычнай адсталасьці жаночых мас. Нам трэба абавязкова дамагчыся зьнішчэньня старых перажыткаў у адносіне да жанчыны работніцы і сялянкі. Трэба ўжыць усю нашу здольнасьць запальваць і ўздымаць масы, зацікавіць іх у справе нашага сацыялістычнага будаўніцтва, каб жанчына стала актыўным удзельнікам нашага палітычнага жыцьця і сацыялістычнага будаўніцтва. Трэба больш энэргічна вылучаць жанчын—грамадзкіх працаўніц, жанчын актывістак на палітычную і грамадзкую працу. Да надыходзячых выбараў трэба паставіць пэўныя і цьвёрдые задачы, вызначыць пэўны процант для кантролю нашай працы па ўзьняцьцю жаночай актыўнасьці.

4) Калі жаночая непісьменнасьць зьяўляецца вынікам становішча жанчыны ў эканоміцы і быце ў мінулым, калі яна толькі ў нязначнай меры прымала ўдзел у фабрычна-заводзкай вытворчасьці, калі на яе ў сялянскім двары глядзелі перш за ўсё, як на рабочую сілу, дык зараз пры савецкай уладзе трэба павесьці самую рашучую барацьбу за зьнішчэньне старой спадчыны і за ўсеагульную пісьменнасьць жанчыны. Трэба дамагацца, каб процант дзяўчат у школах ня быў ніжэй процанту хлопцаў. Трэба дамагацца, каб сярод дарослых жанчын работніц і сялянак, асабліва ўзмоцнена вялася праца па ліквідацыі непісьменнасьці. Трэба дамагацца, каб жанчына зрабілася сталым чытачом нашай газэты, кнігі, каб яна была правадніком газэты і кнігі ў сям'ю. Жаночая пісьменнасьць будзе азначаць буйнейшую культурную перамогу ў нашай краіне, бо толькі пры жаночай пісьменнасьці можна замацаваць усеагульную пісьменнасьць у краіне і забясьпечыць выхаваньне сьвядомага будучага пакаленьня. Толькі пры ўсеагульнай жаночай пісьменнасьці можна зьліквідаваць старыя забабоны, усё яшчэ пануючыя плёткі, старыя надзеі на бога і ўсё іншае, што перашкаджае культурнаму ўздыму шырокіх мас.

Узьняцьце палітычнага і культурнага ўзроўню жаночай масы, вызваленьне жанчыны ад забабонаў, стварэньне эканамічных умоў для поўнага раўнапраўя жанчыны з мужчынай,—зьяўляецца адназ з важнейшых задач, якія стаяць перад савецкай дзяржавай. Усе работнікі савецкай дзяржавы, усе работнікі нашай партыі павінны пакласьці ўсе сілы для вырашэньня гэтай важнейшай палітычнай і культурнай задачы.

Б. КНОРЫН.

Шчырае прывітаньне працоўным жанчынам у дзень міжнароднага сьвята.

Пралетарыят і працоўныя масы ўсіх краін сьвяткуюць дзень 8-га сакавіка, як дзень, сымбалізуючы барацьбу працоўных мас за вызваленьне з-пад уціску эксплёататараў.

У розных краінах сьвята будзе сьвяткавацца парознаму, пры розных умовах і пад рознымі лёзунгамі, але пры агульным імкненьні да аднальновай мэты—да сацыялізму.

У тых краінах, дзе яшчэ і дагэтуль панае буржуазея, працоўныя масы ня будуць сьвяткаваць свае сьвята так, як ім хацелася-б. Буржуазея самым злосным чынам вядзе барацьбу са ўсякім правяўленьнем рэвалюцыйнай думкі; асабліва ёй не падабаецца імкненьне работніц, сялянак і наогул працоўных жанчын да ўстанаўленьня належных правоў працоўнай жанчыны. Яна падтрымоўвае буржуазны жаночы рух, які сваёй мэтай ставіць набыцьцё „дэмакратых" і правоў для арыстакратак і ні ў якім разе не для працоўнай жанчыны, таму асноўныя лёзунгамі правядзеньня Міжнароднага Жаночага Дню ў буржуазных краінах павінна быць: «ЗА ВЫЗВАЛЕНЬНЕ ПРАЦОЎНАЙ ЖАНЧЫНЫ; БЯЗЬЛІТАСНАЯ БАРАЦЬБА ПРАЛЕТАРЫЯТУ ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ МАС З СУСЬВЕТНЫМ ІМПЭРЫЯЛІЗМАМ. ЯКІ ПАДРЫХТОЎВАЕ НАПАД НА КРАІНУ САВЕТАЎ; ДАЛОЎ ВАЙНУ, ЯКАЯ НЯСЕ ЖУДАСНАЕ ГОРА ПРАЦОЎНЫМ: УСЕ СІЛЫ І СРОДКІ НА ЎЗМАЦНЕНЬНЕ СССР, ЯК БАЗЫ СУСЬВЕТНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ, ЗА КАСТРЫЧНІК ВА ЎСІМ СЬВЕЦЕ, БО ТОЛЬКІ ПРАЛЕТАРСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ ЦАЛКАМ І ДА КАНЦА ВЫЗВАЛЯЕ ЖАНЧЫНУ АД ВЕКАВОГА ЎЦІСКУ».

У нашых умовах, ва ўмовах савецкага ладу і пралетарскай дыктатуры мы сьвяткуем Міжнародны Жаночы Дзень пад лёзунгам усё большага ўзмацненьня сацыялістычнага будаўніцтва. Канкрэтна мы павінны будзем праверыць, што мы зрабілі па ўцягненьню працоўнай жанчыны ў савецка-гаспадарчае будаўніцтва, што мы зрабілі дзеля палепшаньня бытавых умоў жыцьця работніц і сялянак і г. д.

Дзень ВОСЬМАГА сакавіка павінен быць днём агляду нашых пралетарскіх сіл на фронце будаўніцтва сацыялізму.

М. ГАЛАДЗЕД.

Разьмеркаваньне мандатаў у новым польскім сойме.

ПРЫХІЛЬНІКІ ПІЛСУДЗКАГА МЕЦЬМУЦЬ ПЕРАВАЖАЮЧУЮ БОЛЬШАСЬЦЬ.—ДЭПУТАТАМ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАГА АДЗІНСТВА ЗАБЯСЬПЕЧАНА ПАДТРЫМАНЬНЕ АД БОЛЬШАСЬЦІ ДЭПУТАТАЎ, ПРАЙШОЎШЫХ ПА МЯСЦОВЫХ СЬПІСАХ.

ВАРШАВА, 6-3. Польскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што мандаты ў новым сойме будуць разьмеркаваны, як відаць, такім парадкам: блёк супрацоўніцтва з урадам—135 мандатаў, ППС—63, блёк нацыянальных меншасьцяў—56, «Вызваленьне»—36, нацыянальныя дэмакраты—37, блёк Пяста і хрыстыянскіх дэмакратаў—34, сялянскі саюз Домбскага—25, блёк сацыялістычных партый Украіны—11, украінская партыя сельробу—9, нацыянальна-рабочая партыя (правая)—9, нацыянальны яўрэйскі саюз Малапольшчы (Заходняя Украіна)—6, камуністы—5, радыкальная хрыстыянская партыя—4, украінская партыя працы—1, расейскае белагвардзейскае аб'яднаньне—1, розныя мясцовыя сьпісы—12.

УВАГА: у склад «блёку супрацоўніцтва з урадам», які атрымаў найбольшы лік галасоў, уваходзяць падтрымліваючыя ўрад Пілсудзкага прадстаўнікі прамысловцаў, буйныя абшарнікі, кансэрватары, прадстаўнікі генэралітэту, былыя дзеячы партыі „Вызваленьне" і сялянскага саюзу Домбскага так званае „леваё" крыло нацыянальна-рабочае партыі, група яўрэйскіх купцоў і іншыя падтрымліваючыя ўрад групоўкі.

Сярод 12-ці ман атаў, залічаных у вышэйпаведзеным паведамленьні польскага тэлеграфнага агенцтва ў катэгорыю розных мясцовых сьпісаў, ёсьць 2 мандаты „Адзінскага сьпісу ня стаіць на платформе рабоча-сялянскага адзінства, далей,—3 мандаты, якія атрымала Беларуская Грамада ў Навагрудку, 2 мандаты „правага крыла" Беларускае Грамады, атрыманыя ў выбарчай акрузе Ліды, і мандат леваё сялянскае групы „Самадапамогі" ў Любліне, і магчыма, і мандат сьпісу Верхняе Сілезіі, які стаіць на камуністычнай плятформе, і інш.

Удзел выбаршчыкаў.

Па вестках «Глосу Правды» (за 5-III), удзел правамоцных выбаршчыкаў выяўляецца такімі лічбамі:

60 проц.: *Станіславоў,* **Сьвянцяны.**

65 проц.: *Варшава—места, Лодзь—павет.*

70 проц.: *Плоцк, Бэндзін, Шаматулы, Новы Сонч,* **Навагрудак.**

75 проц.: *Астроў,* **Беласток, Горадня,** *Ломжа, Цеханаў, Ловіч, Блоне, Вадовіцы, Тарноў, Ржэшаў, Пшэмысль,* **Берасьце, Вільня.**

80 проц.: *Кельцы, Бяла Падляшская, Тчэва, Грудзёндз, Торунь, Гнезно, Пазнань—павет, Астроў—Пазнанскі, Самбор, Тарнопаль, Крэмянец,* **Ліда,** *Лодзь—места.*

85 проц.: *Стрый.*

90 проц.: *Влоцлавэк, Замосьце, Быдгошча, Катовіцы.*

У параўнаньні з 1922 г. заходня-беларускія акругі паказваюць наогул больш ўдзел выбаршчыкаў у выбарах. Так, у Навагрудскім вокругу ў 1922 г. зьявілася на выбары 54 проц. выбаршчыкаў, цяпер—65 проц.; у Лідзкім—58—проц., а цяпер—70 проц.; у Берасьцейскім—49 проц., а цяпер—75 проц., у Сьвянцянскім—51 проц., а цяпер—60 проц.

Выбарчая барацьба ў Зах. Украіне.

ПАГІБЕЛЬНЫ ЎПЛЫЎ БАРАЦЬБЫ НА ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ.

ВАРШАВА, 6-3. Раскол рабоча-сялянскіх арганізацый на Заходняй Украіне адбіўся на выніках выбараў надзвычайна пагібельна. Змаганьне за 2 рабоча-сялянскія сьпісы ў Львове і 2 сельробаўскія набывала часам форму надзвычайна вострае палемікі. Асабліва востра выступаў сельроб, які адважваўся на недапусьцімыя па тоне выпады проці іншых рабоча-сялянскіх сьпісаў.

ВЫБАРЧЫ ЎДАР ПА УКРАІНСКІХ РЭНЭГАТАХ.

ВАРШАВА, 6-III. Сьпіс № 13 (рабоча-сялянскага адзінства) атрымаў у Львове на выбарах у сойм 4.200 галасоў. Сьпіс, высунуты адначасна ў Львове групаю рэнэгатаў, былых сяброў камуністычнае партыі Заходняе Украіны на чале з Крылікам, атрымаў толькі 106 галасоў. Хоць абодвы сьпісы ня маюць мандатаў, але вострая розьніца ў ліку галасоў, сабраных сьпісам рабоча-сялянскага адзінства і групкаю раскольнікаў, выразна характарызуе нічэмны ўплыў гэтае групкі сярод пралетарыяту Львову.

ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ

У Варшаве

Поўнага падліку галасоў у сягоньня атрыманых намі польскіх газэтах яшчэ няма. Канчатковыя вынікі па ўсяму абшару дзяржавы галоўная выбарчая камісія павінна была абвясьціць 7-га сакавіка, але вестак яшчэ няма. У апошніх польскіх газэтах адносна Варшавы ёсьць весткі толькі з 275 выбарных абводаў.

Сьпісак № 1 (урадавы)—126.900 галасоў, № 2 (пэпээсы)—31.500, № 4 (бунд)—13.000, № 13 (рабоча-сялянскага адзінства)—48.500, № 18 (нацмен.)—31.522, № 24 (эндэкі, хадэкі, пястаўцы)—72.022, № 33 (яўрэйскіх нацыяналістаў)—16.434.

Прыблізны падзел мандатаў такі: урадавы сьпісак—6, рабоча-сялянскага адзінства—2, нацмен.—2, эндэкі, хадэкі, пястаўцы—3, ППС—1, яўрэйскія нацыяналісты—1.

У 1922 г. па Варшаве камуністы атрымалі 26.920 галасоў, ППС—83241, Х'ена — 168.582, нацмен.—50.558, бунд—18.986, унія нацыяльна-дзяржаўная—16.804.

Хоць канчатковы падлік галасоў яшчэ не абвешчаны, але ўжо вызначыўся рэзкі ўзрост галасоў, пададзеных за камуністаў, і яшчэ болей рэзкае зьніжэньне галасоў, пададзеных за ППС.

У Віленскай акрузе.

Па 65 абводах з агульнае лічбы 95 па Вільні і Віленска-Троцкаму павету № 1 атрымаў 35.547 галасоў, № 18 (нацмен)—16.942; № 24 (эндэкі)—18.903; № 3 (вызваленцы)—15.700; № 2 (пэпээсы)—11.327. Прыблізны падзел мандатаў: № 1—2, № 18—1 (яўрэйскі дзеяч Выгодзкі), № 24—1. Пяты мандат можа дастацца альбо вызваленцам альбо пэпээсам у залежнасьці ад вынікаў застаўшыхся 30 абводаў.

У Сьвянцянах.

«Газэта Варшавска» (6-III) лічыць, што ў Сьвянцянскай выбарнай акрузе пройдуць тры кандыдаты сьпіску № 18, два ад № 1, адзін ад № 2 (пэпээсы). Як ведама, па сьпіску № 18 першымі стаяць у Сьвянцянах Каруза, Стэповіч, Юхневіч—беларускія хадэкі.

Паражэньне ППС на выбарах.

ВАРШАВА, 6-III. У выніку паражэньня ППС на выбарах у гарадох, у сойм не прайшлі буйнейшыя пэпээсаўскія кандыдаты—Дымаанд, Лібэрман і Гаусэнэр. У Дамброўскім райёне, пасьля канчатковага падліку галасоў, за пэпээсаўцамі прызнан адзін мандат, які па папярэдніх падрахунках прысуджалі пілсудчыкам. Такім чынам, з 6 наяддатаў Дамброўскага райёну 3 мандаты атрымалі камуністы, два пілсудчыкі і адзін пэпээсаўцы.

* * *

ВАРШАВА, 6-III. Ацэньваючы вынікі выбараў у сойм, у палітычных колах зазначаюць, што выбары далі вялікую, нечаканую перамогу пілсудчыкам. Урадавая «Эпока» прызнае, што пілсудчыкі самі не чакалі такога спрыяючага сканчэньня выбараў для іх. Орган ППС «Работнік» прызнае, што вынікі выбараў у Варшаве і Дамброўскім райёне зьяўляецца сур'ёзнай перасьцярогай для ППС.

Орган Пілсудзкага «Глос Правды» піша: „ППС перастае быць рабочай партыяй. Аб гэтым ясна сьведчаць вынікі выбараў. ППС перадае кіраўніцтва рабочымі масамі ў іншыя рукі, пераходзячы на пазіцыі мяшчанства і дробнага сялянства».

Далей у палітычных колах адзначаюць сур'ёзнае паражэньне ранейшага правага блёку. У ранейшым сойме правы блёк меў большасьць мандатаў. Цяпер жа эндэкі разам з пястам і хрысьціянскімі дэмакратамі маюць усяго 69 мандатаў.

КАМУНІСТЫЧНЫЯ СЬЦЯГІ І АДОЗВЫ Ў ВІЛЬНІ.

За дзень перад выбарамі ў розных мясцох Вільні былі вывешаны чырвоныя сьцягі з лёзунгамі кампартыі і раскіданы адозвы.

У АПОШНІ ЧАС

(Атрымана а 1-ай г. ночы).

ЛЁКАУТ НА ПРАДПРЫЁМСТВАХ КАМПАНІІ СІМЭНСА.

БЭРЛІН, 7-3. Сёньня лёкаутавана 15.000 рэшты рабочых электратэхнічнае кампаніі Сімэнса, якія яшчэ заставаліся на працы. З іх звальненьнем лёкаут пашыраецца на ўсіх рабочых кампаніі Сімэнса ліках каля 60.000 ч. Лёкаут зьяўляецца адказам на забастоўку бэрлінскіх інструментальшчыкаў і мае мэтай зрабіць націск на перамаўленьні, якія пачынаюцца сёньня між прадстаўнікамі рабочых інструментальшчыкаў і прадпрыёмцамі.

Арышты.

У Варшаве.

За агітацыю на карысьць сьпіску № 13 у Варшаве арыштавана на Пазнанскай вуліцы 6 чалавек моладзі ад 16 да 20 год.

На Сьвентаерскай вуліцы на двары дому № 22 паліцыя разагнала мітынг сьпіску № 13.

На Шпітальнай вул. арыштаваны пехта Вэндрыхоўскі з 500 «процідзяржаўных адозваў». На Празе арыштаваны Шэрпякоўскі.

У Заходняй Беларусі.

У Сьвянцянах за выбарную агітацыю арыштавана 9 чалавек.

У Пастаўскім павеце ў райёне аднае з абводных камісій адбылася сутычка выбаршчыкаў з паліцыяй. Некалькі чалавек арыштавана.

У правінцыі.

У Кракаве за выбарчую агітацыю арыштавана 12 чалавек, у Станіслаўскім павеце арыштавана трое вупіяцкіх папоў украінцаў і трое украінскіх буржуазных дзеячоў.

У в. Залужа (пад Сьнятынем) адбылася сутычка выбаршчыкаў украінцаў з паліцыяй. Некалькі чалавек арыштавана.

НАПАД НА КАНДЫДАТА БЛЁКУ НАЦМЕНШАСЬЦЯЎ.

На мітынг блёку нацменшасьцяў у Кастаполі (Валынскае ваяводзтва) уварвалася група бандытаў, якія кінуліся на кандыдата блёку Родфэльда і цяжка яго паранілі.

РАЗГОН КАМУНІСТЫЧНАЙ ДЭМАНСТРАЦЫІ.

З сакавіка, г. ё. за дзень да выбараў у польскі сойм, у Варшаве з'арганізавалася камуністычная дэмэнстрацыя, якая была разагнана паліцыяй.

ПЭТАРДА НА МІТЫНГУ КАТАЛІЦКАЙ ВУНІІ.

У Грундзёндзе на мітынгу каталіцкай вуніі была кінута вайсковая пэтарда, якая разарвалася і выбіла шыбы ва ўсіх вокнах. Арыштаваны кейні Л. Куліскі і К. Кіоль па абвінавачаньні ў замаху на мітынг.

ВЫБАРЫ Ў СОЙМ І «ВЯЛІКАЯ ПОЛЬШЧА».

Орган „радавага блёку сапацыйны „Курэр Віленскі", заклікаючы грамадзянства галасаваць за сьпісак урадавага блёку (№ 1), пісаў у дзень выбараў:

„Будзем памятаць, што перамога сьпіску № 1 зьяўляецца перамогай вялікай і магутнай Польшчы".

Няшчасныя выпадкі ў Варшаве.

Агітацыйныя самаходы ўрадавага і эндэцкага сьпіскаў пераехалі трох малалетніх дзяцей: аднаго—3 г. і адну дзяўчынку 5 г.

АКЦЫЯ ЛІКВІДАЦЫІ КАМПАРТЫІ ЗАХ. БЕЛАРУСІ.

«Газэта Поранна» паведамляе, што акцыя ліквідацыі кампартыі Зах. Беларусі, распачатая гэтымі днямі, ужо амаль зусім закончана. У Слонімскім пав. арыштавана 27 асоб, у Стаўпецкім—6. На абшары Навагрудзкага і Лідзкага паветаў арышты яшчэ ідуць.

«БЕЛАРУСКІ РАДНЫ».

Гэтымі днямі выйшаў у Вільні № 1 часопісі «Беларускі Радны», які выдаецца В. Друцкім-Падбярэскім, Шыбкай і Кападзкім,—«дзеячамі» паўлюковічаўскіх арганізацый.

БЕЛАРУСКАЯ АДНАДНЕЎКА.

29 лютага ў Вільні выйшла беларуская аднаднёўка пад назваю «Голас Працы».

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

„РАБОТНІЦЫ ЎСЯГО СЬВЕТУ СТАНУЦЬ НА АБАРОНУ СССР".

Зварот Клары Цэткін да работніц і сялянак СССР.

МАСКВА. Тав. Клара Цэткін у адозве да работніц і сялянак у зьвязку з Міжнародным Жаночым Днём зазначае: «З гонарам і ўздымам сочаць працаўніцы зарубежных краёў, як вы з шчырараю аддачасьцю, з жалезнай упартасьцю і энэргіяй, перамагаючы вялікія цяжкасьці будаўніцтва сацыялістычнае гаспадаркі СССР, удзельнічаеце гэтым самым у падрыхтоўцы сусьветнае рэвалюцыі. Працоўныя жанчыны ўсіх капіталістычных краёў пільнуюць за ваеннымі падрыхтоўкамі сваіх урадаў проці СССР і заўсёды гатовы сваячасна адхіліць злачынную руку і цаною свайго жыцьця не дапусціць да нападу на СССР.

У Міжнародны Жаночы Камуністычны Дзень на тысячах сходаў моцна прагучыць з вуснаў соцень удзельніц рабочых дэлегацый, якія паведаліся СССР, праўда пра магутную творчую працу міліённых мас СССР».

Сельска-гаспадарчы падатак на 1928-29 г.

МАСКВА. Калегія Наркамзему РСФСР, заслухаўшы даклад аб сельска-гаспадарчым падатку на 1928-29 г., ухваліла пастанову, у якой зазначана: «У зьвязку з тым, што за апошнія гады сельская гаспадарка значна ўзмацнілася, а таксама бяручы пад увагу вызваленьне ад падатку 35 проц. сялянскіх гаспадарак, лічыць магчымым павялічыць агульную суму падатку ў 1928-29 г. на 30—35 проц. з тым, каб павялічэньне закранула, пераважна, больш заможныя групы сялянства.

Прызнана мэтазгодным, дзеля перазьмеркаваньня цяжару падатку між розьнымі сацыяльнымі групамі, перайсьці на камбінаваны спосаб падводкі прагрэсіі абкладаньня на гаспадарку з вынятам сдакоў, а таксама ўстанавіць дыфэрэнцыяльную норму прыбытковасьці, прычым у аснову дыфэрэнцыяцыяцы ляжа забясьпечанасьць гаспадаркі рабочаю жывёлаю.

Пастанова прадугледжвае некаторыя палёгкі з мэтаю разьвіцьця лёнаводзтва, жывёлагадоўлі і іншых галін сельскае гаспадаркі.

ДРУГОЕ ВЫСТУПЛЕНЬНЕ ФОРДА ЗА ПРЫЗНАНЬНЕ СССР.

НЬЮ-ЁРК, 7-III. Форд у гутарцы з прадстаўніком аднаго газэтнага аб'яднаньня заявіў: «Я перакананы, што Расею чакае багацьце і роскві т. Расея можа стаць вышэй за некаторыя іншыя нацыі. Я думаю, што крэдыт Расеі будзе стаяць высока, бо расейскі народ заслугоўвае таго, каб яму верыць. Я лічу таксама, што Расея заслугоўвае прызнаньня».

Рух за аднаўленьне зносін з СССР у Канадзе.

НЬЮ-ЁРК, 7-III. На канфэрэнцыі фэрмерскага саюзу Альбэрты (правінцыя Канады) ухвалена рэзалюцыя, якая патрабуе аднавіць гандлёвыя і палітычныя зносіны з СССР, а таксама ганьбіць канадзкі ўрад Макензі-Кінга за разрыў зносін з СССР па прыкладзе Англіі.

На канфэрэнцыі выступіў міністр земляробства Гудбі, які дарэмна спрабаваў перашкодзіць ухвале гэтае рэзалюцыі.

НА СЭСІІ РАДЫ ЛІГІ НАЦЫЙ.

БУТАФОРСКАЯ ШУМІХА АБ САНГАТАРДЗКІМ ІНЦЫДЭНЦЕ.—НАРАД МІНІСТРАЎ «ВЯЛІКІХ ДЗЯРЖАЎ» АБ АДНОСІНАХ ДА САВЕЦКАЕ КАНВЭНЦЫІ АБ РАЗБРОЕНЬНІ.

ЖЭНЕВА, 6-3. З прычыны таго, што Чэмбэрлен супярэчыць проці дакладу наконт сан-гатардзкага інцыдэнту, пытаньне аб гэтым інцыдэнце будзе абмяркоўвацца на зачыненым пасяджэньні рады Лігі Нацый.

На сёньнешнім адчыненым пасяджэньні рады абмяркоўвалася пытаньне наконт розных канвэнцый, ухваленых Лігаю Нацый. У спрэчках падкрэсьлівалася, што шмат канвэнцый да гэтага часу не зацьверджана ніводнаю з дзяржаў. Рада ўхваліла наконт гэтага рэзалюцыю, у якой выказвае жаданьне паскорыць зацьверджаньне ўхваленых Лігаю Нацый канвэнцый.

Увечары адбылася нарада між Брыянам, Чэмбэрленам, Штрэзэманам, італьянскім дэлегатам Шалойя і японскім дэлегатам Адатэй. Афіцыйная мэта нарады—устанавіць парадак абмеркаваньня сан-гатардзкага непаразуменьня; аднак, добра асьвядомленыя колы заяўляюць, што гадоўнаю і сапраўднаю мэтаю нарады зьяўляецца «пагоджаньне погляду наконт тактыкі ў адносінах да савецкага праэкту канвэнцыі аб разброеньні».

ДЗЕЛЯ ПАДТРЫМЛІВАНЬНЯ ПРЭСТЫЖУ ЛІГІ...

РЫМ, 6-3. Італьянскі друк паведамляе, што ў Жэневе адбываюцца жвавыя закулісныя перамовы ў зьвязку з надыходзячым абмеркаваньнем у Лігі Нацый сан-гатардзкага непаразуменьня. Галоўная мэта гэтых перамоў—дамагчыся згоды Нямеччыны назначыць сьледчую камісію.

Да апошняга часу большасьць італьянскіх газэт думала, што пытаньне аб сан-гатардзкім непаразуменьні будзе зьнята з парадку дня на сучасной сэсіі рады Лігі Нацый, бо Англія і Італія рашуча супярэчылі проці расьсьледаваньня непаразуменьня. Цяпер, аднак, асьвядомленыя італьянскія газэты паведамляюць, што пазіцыя Чэмбэрлена зьмянілася; жадаючы ўзмацніць прэстыж Лігі Нацый, Чэмбэрлен, водлуг апошніх паведамленьняў, думае нібыта падтрымаць патрабаваньне аб назначэньні сьледчае камісіі, але «у такой форме і з такімі паўнамоцтвамі, каб назначэньне камісіі ня было зьнявагаю для Вэнгрыі».

Вальдэмарас аб польска-літоўскім канфлікце.

КОЎНЯ, 6-3. Літоўскі прэм'ер Вальдэмарас, адказваючы на запытаньне прадстаўнікоў друку наконт меркаваных польска-літоўскіх перамоў у Кёнігзбэрзе, заявіў: «Нармальныя перамовы з Польшаю могуць адбыцца толькі пасьля вырашэньня віленскага пытаньня». У адказе на іншыя пытаньні Вальдэмарас заявіў, што наўрад ці будзе польска-літоўскае пытаньне абмяркоўвацца ізноў у радзе Лігі Нацый, «але нельга за гэта паручыцца, як нельга паручыцца, што Польшча рантам ня створыць небясьпекі вайны».

Далей Вальдэмарас паведаміў, што пры перамовах з Польшчаю ён сам будзе стаяць на чале літоўскае дэлегацыі.

У ЖЭНЕВУ ЕДЗЕ ВАЛЬДЭМАРАС.

ЖЭНЕВА, 6-3. Галяндзкі дэлегат Ванброкланд, якому даручана зрабіць тэрміновы даклад аб сучасным становішчы польска-літоўскага канфлікту і аб выкананьні Польшчаю і Літвою рэзалюцыі рады Лігі Нацый у сьнежні, запрасіў графам весткі ў літоўскага сьл. Вальдэмараса. Як перадаюць, адведамараса атрымана тэлеграма аб гэтым, што ён прыедзе ў [illegible] тым тыдні.

Пагроза стачкі 65.000 бэрлінскіх камунальнікаў.

БЭРЛІН, 6-3. Прафсаюзы рабочых бэрлінскага трамваю, падземнае чыгункі і аўтабуснага таварыства заявілі аб сваёй адмове аднавіць калектыўны ўгавор, які траціць моц 31-га сакавіка, і высунулі патрабаваньне павялічыць заработак на 15 пфэнігаў у гадзіну.

Рух гэты апляе 21 тысячу рабочых. Калі лічыць разам з рабочымі дзяржаўных прадпрыёмстваў гэтыя, дык 31-га сакавіка спыняецца правамоцнасьць калектыўных угавораў, якія датычаць 65-ці тысяч рабочых бэрлінскіх прадпрыёмстваў грамадзкага карыстаньня.

У ШАНХАІ ВЫКРЫТА КАМУНІСТЫЧНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ.

ШАНХАЙ, 6-3. Агенцтва нанкінскага ўраду Гамінь паведамляе, што сёньня ўлада ў Нанкіне выкрыла штаб нелегальнае камуністычнае арганізацыі.

Двое камуністаў арыштаваны.

ЗАГАД ЧАН-КАЙ-ШЫ.

ШАНХАЙ, 6-3. Газэта «Шунь-Бао» паведамляе, што Чан-Кай-Шы асабіста выдаў загад, якім забараніць вызваляць асоб, арыштаваных на западозранасьці ў прыналежнасьці да кітайскае камуністычнае партыі.

КАМУНІСТЫЧНАЕ ВОЙСКА Н

Міжнародны Жаночы Дзень—сьвята працоўных усяго сьвету.

Узьняцьце палітычнага і культурнага ўзроўню жанчын, стварэньне эканамічных умоў для поўнага раўнапраўя жанчыны з мужчынам—адна з галоўных задач савецкай улады і камуністычнай партыі.

ЖАНЧЫНА—АКТЫЎНЫ БУДАЎНІК САВЕЦКАЕ ДЗЯРЖАВЫ.

У выніку працы з жаночым актывам прафсаюзных, савецкіх і іншых арганізацый, жанчына ўцягнута ва ўсе іншы арганізацыі, а іменна:

У ПРАФСАЮЗАХ.

Нізавы жаночы прафактыў кольвасна расьце з году ў год. У 1926 г. ўцягнутых у прафпрацу лічылася 10 проц. усяго складу работніц—членаў саюзаў, у 1927 г.—12 проц. ці 20 проц. усяго складу прафактыву. Большасьць з работніц уцягнуты ў культкамісіі (25 проц.), у камісіі па ахове працы (23 проц.), зборшчыкамі членскіх узносаў (23,5 проц.), менш у жэвкамісіі (15 проц.), РКК (12,4 проц.) і яшчэ менш у вытворчыя камісіі (11,7 проц.).

У складах фабзавкомаў колькасьць работніц павялічылася: у 1926 г. было 16,7 проц., у 1927 г.—17 проц. Таксама павялічылася ўдзяленьне работніц у вышэйшыя прафарганізацыі: у акруговых праўленьнях саюзаў у 1926 г. было 197 работніц ці 18 проц., у 1927 г.—272 ці 18 проц. У ЦК у 1926 г.—63 работніцы ці 16 проц., у 1927 г.—73 ці 18 проц., у ЦКПСБ у 1926 г. было 5 работніц, ці 7 проц., у 1927 г.—13, ці 13 проц.

З колькасным ростам работніц, у прафесыянальнай працы наглядаецца рост іх палітычнай актыўнасьці, што асабліва выявілася пры перавыбарах фабзавкомаў. На прадвыбарчых сходах на вытворчых саюзах удзельнічала 68 проц., на выбарчых 70 проц., на саюзах разуновай працы: на прадвыбарчых сходах удзельнічала 63 проц. і на выбарчых—57 проц. Выступала ў спрэчках 7 проц. прысутных работніц.

Рост актыўнасьці работніц спрыяе ўзмацненьню вылучэньня работніц на кіраўнічую працу. У нізавых арганізацыях вылучаных работніц у 1926 г. было 37, у 1927 г.—54. У акруговых аддзяленьнях саюзаў на кіруючай працы было 18 работніц, у цэнтральных праўленьнях замест 3—6. Вылучаныя на кіруючую працу работніцы спраўляюцца з працай і карыстаюцца сярод рабочай масы аўтарытэтам.

У САВЕТАХ.

Колькасьць работніц і жон рабочых у складах гарсаветаў у 1927 г. у параўнаньні з 1926 г. павялічылася па акруговых гарадох на 1 з пал. проц. і па неакруговых—на 2 з пал. проц.

Жанчыны-члены гарсаветаў прымаюць актыўны ўдзел у правядзімых кампаніях, асабліва актыўна ўдзельнічалі ў кампаніі па зьніжэньню цэн і ў працы па абсьледаваньню лекавых устаноў.

Наведаньне гарсаветаў дэпутаткамі на асобных гарадох перавышае процант наведваньня мужчынамі: па Менскаму і Барысаўскаму гарсаветах пленумы наведваюцца жанчынамі на 66 проц., сэкцыі—на 76 проц., тады як мужчынамі наведваюцца пленумы на 52 проц., сэкцыі—на 49 проц.

Выбары ў 1927 г. далі зьмяншэньне колькасьці членаў сельсаветаў сялянак у нізавых органах улады—у сельскіх і местачковых саветах з 8,5 пр. да 7,2 проц. Гэта тлумачыцца тым, што, перш-наперш, на яго было звернута належнай увагі вылучэньню кандыдатур сялянак і, падрэсьленьне выбарчых вучасткаў адбілася на зьмяншэньні ў саветах сялянак, дзе пры выбарах аднаго-двух членаў савету выбіралі сялян, а не сялянак. Заўважаліся выпадкі варожых адносін сялян да вылучэньня кандыдатур сялянак у зьвязку з тым, што ня было праведзена выстарчальнай растлумачальнай працы.

На сацыялістычнаму становішчу жаночы нізавы актыў сельсаветаў здавальняючы, але разам з гэтым неабходна адзначыць надзвычайна малое ўцягваньне батрачак. У паасобных раёнах маюцца факты, калі ў сельсаветы пралазілі кулакі (у Аршанскім раёне, Аршанскай акругі ў абранай у кандыдаты трэба было зрабіць абрэзку зямлі).

Дзякуючы таму, што ў сельсаветы былі абраны сялянкі, якія ўжо выявілі сябе з лепшага боку, працаздольныя і актыўныя на практычнай працы ў вёсцы, трохі павялічылася вылучэньне сялянак на кіруючую працу ў якасьці старшынь і сэкратароў сельсаветаў, але гэтае вылучэньне ўсё яшчэ застаецца слабым. Старшынь сельскіх і местачковых саветаў у 1926 г. было 0,9 проц., у 1927 г.—1,1 проц. Але гэтае вылучэньне ўсё яшчэ ідзе вельмі павольна і няўпэўнена, ня глядзячы на тое, што маецца новы актыў сялянак і працуючыя на кіруючай працы сялянкі спраўляюцца са сваёй працай і карыстаюцца аўтарытэтам сярод сялянства.

Сялянкі, якія актыўна працуюць у сельсаветах праводзяць правільную лінію ў вёсцы, зьяўляюцца арганізатарамі вёскі, карыстаюцца аўтарытэтам сярод работнікаў сельсаветаў і сярод насельніцтва. Сялянкі, абраныя ў саветы, пачалі займаць значнае месца ў саветах, але гэтае права ім прыходзіцца адваёўваць.

У КААПЭРАЦЫІ.

Уцягваньне жанчын у праўленчаскіяі органы ЦРК ідзе вельмі павольна. У праўленьнях ЦРК лічылася 10,8 процантаў, тады як пайшчыкаў жанчын 23,3 проц. Таксама паволі ідзе ўцягваньне ў склад упаўнаважаных ЦРК (15 проц.) Трохі больш уцягнута жанчын у лавачныя камісіі (26,1 проц.).

Уцягваньне працоўных жанчын у органы жыльлёвай каапэрацыі павялічваецца. У 1926 г. у складзе праўленьняў было 5,7 проц. жанчын, у 1927 г.—9,9 проц. Апроч таго, пайшчыцы больш усяго ўцягваюцца ў культурна-бытавыя камісіі і саветы пляцовак.

У Бежыцкаазе з жаночым актывам праводзіцца вялікая праца: праводзяцца канфэрэнцыі, нарады, у выніку чаго жаночы актыў працуе добра па арганізацыі бытавых устаноў.

Перад каапэрацыйнымі арганізацыямі партыяй пастаўлены задачы: 1) павялічыць уцягваньне работніц бядняцак і серадняцак і, асабліва, батрачак у кіруючыя і кантралюючыя органы каапэрацыі, а разам з тым больш рашуча праводзіць вылучэньне іх на кіруючую працу; 2) паладзіць працу па ўцягваньні абраных і практыкантак-дэлегатак у практычную працу; 3) весьці вучот актыву і кандыдатаў, прыцягваючы апошніх на пасяджэньні і да практычнай працы.

У КАМІТЭТАХ СЯЛЯНСКАЙ УЗАЕМАДАПАМОГІ.

Уцягваньне сялянак у нізавыя органы сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі: сельупаўнаважанымі—5 проц у селькамітэтах 5 проц., у райкамітэтах—12 проц., у акруговых камітэтах—12 проц. і ў ЦК—6 проц. Вылучэньне на кіруючую працу сялянак ідзе надзвычайна марудна, ня гледзячы на тое, што ёсьць актыў, адкуль можна браць сілы. У практычную працу абраныя ўцягваюцца слаба.

У далейшым перад сялянскімі таварыствамі ўзаемадапамогі стаіць задача ўзмацніць уцягваньне батрачак, бядняцак і серадняцак у органы Камітэтаў Сялянскіх Таварыстваў Узаемадапамогі, а разам з тым прыцягваюць іх да практычнай працы.

У СУДОХ.

Колькасьць нарасядацельніц з году ў год расьце. У гарадох у 1926 г. было 879, у 1927 г.—1246, у вёсцы—у 1926 годзе 3008, у 1927 г.—3755. Разам з тым павялічваецца вылучэньне на судовую працу, але вельмі марудна. Нарсудзьдзяў у гарадох 4, пракураў—4, нарсудзьдзяў у вёсцы—2, сьледчых у вёсцы—10, у гарадох—3. Усе нарасядацельніцы выклікаюцца на судовыя пасяджэньні ў парадку чаргі. Большасьць і іх актыўна ўдзельнічаюць на пасяджэньнях.

У ДАБРАХВОТНЫХ ТАВАРЫСТВАХ.

Вялікай папулярнасьцю сярод жаночага актыву з дабрахвотных таварыстваў карыстаюцца ТДА-Авіяхіму, Моапр і Чырвоны Крыж, вакол якіх групуецца значны жаночы актыў.

З дабрахвотных таварыстваў жанчыны больш актыўна працуюць у Моапр'ы, дзе праводзяць вялікую працу па збору ахвяраваньняў і дапамогі палітзьняволеным Заходняй Беларусі і Польшчы, арганізуюць пашыўку бялізны для палітзьняволеных і г. д. У Віцебску жаночым актывам праробле на вялікая праца вакол «моапраўскіх палос».

У далейшым перад партыйнымі арганізацыямі стаіць задача пашырыць працу сярод грамадзкіх работніц па растлумачэньні задач, пастаўленых XV партыйным зьездам і пры практычным правядзеньні гэтых пытаньняў уцягваюць жаночы актыў у працу, асабліва, па рацыяналізацыі вытворчасьці, у барацьбу з бюракратызмам і валакітай, па калектывізацыі сельскай гаспадаркі і каапэраваньні сялянак на вытворчасьці, да перабудовы быту, за настойлівую ліквідацыю няпісьменнасьці, да барацьбы з п'янствам і самагонам.

Н. Танаеўцава.

Жанчыны члены ЦВК БССР.

Зьлева направа: работн. Палесдруку т. КАЛАШНІКАВА; сялянка Горацкага р. т. КРОТАВА Матруна; работніца сярніковай ф-кі „Вязуві"; работніца швачка т. ГРОЗНАЯ.

ЖАНЧЫНА БУДУЕ НОВУЮ ВЁСКУ.

Актыўнасьць жанчын паднялася.

(Ад нашага магілеўскага карэспандэнта).

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму акруговага выканаўчага камітэту быў заслухан даклад аб працы сярод жанчын у нашай акрузе.

Трэба сказаць, што ў гэтай галіне ёсьць за мінулы час больш-менш значныя дасягненьні. Папершае, павялічыўся ў параўнаньні з леташнім годам лік сялянак, якія ахоплены дэлегацкімі сходамі, павялічылася і актыўнасьць саміх жанчын. Жанчыны прымаюць непасрэдны ўдзел у працы савецкіх і грамадзкіх арганізацыяў,—жанчыны становяцца больш актыўнымі і самі імкнуцца да практычнай працы.

Значную ролю ў падрыхтоўцы жанчыны да практычнае працы адыгралі раённыя і акруговыя зьезды жанчын, а таксама і трохтыдневыя курсы для жанчын—членаў саветаў. Павялічыўся і лік устаноў, якія разгружаюць жанчыну ад хатняе працы: колькасьць летніх дзіцячых ясляў з 16 узрасла да 35, павялічыўся лік дзіцячых пляцовак і г. д. У акрузе лік розных жаночых гурткоў, а разам з тым за апошні год маем павялічэньне ў тры разы колькасьці выпісваемых жаночых часопісяў.

Да дню восьмага сакавіка прэзыдыум акрвыканкому вырашыў правесьці шэраг мерапрыёмстваў для зьліквідаваньня тых недахопаў у працы сярод жанчын, якія назіраліся дагэтуль. Паміж іншым, пастаноўлена высунуць жанчыну на адказную працу ў акруговы зямельны аддзел; запрапанавана таксама і райвыканкомам вылучыць на адказную працу работніц і сялянак.

Разам з тым, дадзены дырэктывы райвыканкомам і сельсаветам аб прыцягненьні да практычнай працы жанчын-актывістак і прыняць меры да каапэраваньня сялянак у вытворчай каапэрацыі. У заключэньне прэзыдыум акрвыканкому намеціў мерапрыёмствы, якія павінны будуць праводзіцца за кошт мясцовага бюджэту будучага гаспадарчага году.

М-н.

ЗОСЯ ЗЯНКЕВІЧ старшыня Ляхавіцкага с.-с. Полацк. акр.

Удзел у савецкай працы.

Каля сотні рознакаляровых хустак замігала ў клюбе с-савету.

Гэта жанчыны сабраліся на свой жаночы сход.

Сход разглядае пытаньні працы с-сасету. Пытаньне гэта жыцьцёвае і выклікала актыўнасьць. Спрэчкі паказалі, што санітарная культкамісія с-савету дрэнна працуе, у выніку чаго студні вёсак знаходзяцца ў дрэнным (санітарным) становішчы, ня чытаю лекцый сялянам, с-савет кепска сачыў за разьмеркаваньнем сенажаці, якую ў першую чаргу давалі больш заможным.

С-савет мала зьвярнуў увагі на ўцягненьне жанчын у працу с-савету, хаця жанчыны-члены с-савету (іх 2) зьяўляюцца першымі па працаздольнасьці. Дэлегаткі маюць магчымасьць прымаць удзел у працы с-саветаў і яго камісіях.

Думка сходу—прасіць РВК аб адчыненьні акушэрскага ці фэльчарскага пункту ў вёсцы Бытча.

Як бачым дэлегаткі, а таксама і ўсе жанчыны цікавяцца працай мясцовай улады і нягледзячы на некаторыя перашкоды будуюць новую вёску, праз агульны сход і сходы дэлегатак.

В. С.

в. Бытча, Барысаўскі раён.

На карысьць ясьляў у падшэфнай вёсцы.

(Рэчыца, фабр. „Днепр")

На нашай фабрыцы абрана камісія якая ўжо досыць падрабязна апрацавала плян падрыхтоўкі да сьвята Міжнароднага Дню Жанчыны. Па паласобных цэхах праводзяцца гутаркі аб значэньні дню 8-га сакавіка. Работніцы мяркуюць восьмага сакавіка працаваць поўны рабочы дзень і зарплату за дзьве гадзіны ўнесьці на карысьць арганізацыі дзіцячых ясьляў у падшэфнай вёсцы.

Ч-ва.

Актыўны ўдзел у грамадзкім жыцьці.

У дрэнным становішчы знаходзяцца нашы сялянкі, але гэта не перашкаджае росту актыўнасьці і сьвядомасьці сялянкі. Ня пройдзе ніводнага сходу сялян, куды-б ні зьявіліся жанчыны. На сваіх дэлегацкіх сходах сялянкі абгаварваюць пытаньні свайго быту, жыцьця, працы грамадзкіх арганізацый.

Не адзін раз сялянкі, сабраўшыся на свае дэлегацкія сходы, абгаварвалі аб дапамозе дзецям-сіротам, аб тым, што іх мужы п'юць самагон, і сялянкі настойчіва просяць, каб сельсавет і другія грамадзкія арганізацыі прынялі якія небудзь меры для зьнішчэньня гэтага. На адным сходзе сялянкі-дэлегаткі да кожнай грамадзянскай арганізацыі прымацавалі сваіх прадстаўнікоў для дапамогі і азнаямленьня з працай. На апошнім сходзе дэлегаткі ўхвалілі сабраць па пяць кап. на выпіску журналаў і гэтая пастанова, амаль што выканана,—сабрана грошай на 4 журналы.

Селькор А. Зябко.

в. Новая Тухіна, Дубровенскага р. Аршаншчына.



Хата-чытальня ў вёсцы, адчыненая па ініцыятыве сялянак.

Заслаўскія жанчыны арганізоўваюць таварыствы

У нашым пагранічным раёне па адбудаваньню і ўмацаваньню гаспадаркі становішча вёскі досыць актыўны ўдзел бяруць і жанчыны-дэлегаткі, якіх у раёне налічваецца каля 200.

Вось, напрыклад, сяляне вёскі Недраска доўга жылі ў беднаце і «нячысьці», бо скаціне не хапала корму, зямля-ж кепска радзіла і гаспадару ніяк не ўдавалася канцы з канцамі стачыць, а пад богам ляжалі нескарыстаныя вялізарныя плошчы спрадвечных балот.

Былі неяк недрашчанскія дэлегаткі на экскурсіі на бліжэйшай станцыі і даведаліся, што з балота можна мець добрае ўрадлівае поле і сенажаць. Вярнуўшыся да хаты, дэлегаткі патрабавалі ў сваю вёску раённага агранома, склікалі сход і растлумачылі сялянам, якое багацьце ў іх пад бокам ляжыць.

Сход ухваліў арганізаваць мэліарацыйнае т-ва і старшынёй т-ва была абрана дэлегатка. Зараз недрашчанцы маюць моцнае мэліарацыйнае т-ва. Гэтаму т-ву ўдалося ўжо асушыць каля 200 дзесяцін спрадвечных балот.

Асушанае балота ўзорана было трактарам. І зараз недрашчанцы атрымліваюць з дзесяціны да 400 пудоў сена, разьвялі добрую скаціну, у хлявох у кожнага гаспадара дацкія кармушкі, а па падставе ўсяго гэтага разьвілася досыць шырока малочная гаспадарка і побач з мэліарацыйным т-вам недрашчанцы арганізавалі яшчэ і малочную арцель.

І не пазнаць зараз вёскі Недраскі. Заместа раней існаваўшых нізкіх курных хат—у кожнага гаспадара новая вялізная, на дзьве палавіны хата, добрыя будынкі, у хлявох каля дацкіх кармушак стаяць заводныя каровы.

У Дзехцяроўцы пры дапамозе дэлегаткі Тацьцяны Герман удалося арганізаваць малочную арцель, якая зараз у ваколіцах ахоплівае да 100 гаспадароў, і насеннае таварыства «Новы Шлях», дзякуючы якому дзехцяроўцы завялі лепшае сартавое насеньне, як ячмень «Прынцэса», авёс «Залаты дождж» і „Перамога", добрую канюшыну і г. д. і дзякуючы гэтаму ўдалося ўзьняць ураджайнасьць палёў, а таксама вырашчываць сваё сартавое насеньне.

У Заслаўскім спажывецкім таварыстве «Беларускі араты» заданьне было сабраць паёў 1.500 руб., а сабрана да 2.000 руб. і гэта дзякуючы таму, што ў ліку 27 чалавек каапэрацыйнага актыву, які абходам двароў зьбірае паі, ёсьць значная колькасьць жанчын.

У Качыне дзяўчаты разам з хлапцамі сабралі на будову клюбу звыш 100 руб.

Так у нас на пагранічных абшарах дэлегаткі і жанчыны сваёй штодзённай працай змагаюцца за лепшае будучае беларускае вёскі.

Т.

Заслаўскі р., Меншчына.

Работніцы і сялянкі! Дапамагайце ўзмацненьню Чырвонай армії

Уступайце ў вайсковыя і санітарныя гурткі. Рыхтуйцеся да абароны Савецкага Саюзу.

УДЗЕЛ ЖАНЧЫНЫ У ПРАЦЫ ТДА-АВІЯХІМУ.

Справа ваенізацыі насельніцтва можа быць з посьпехам вырашана толькі тады, калі гэтай працай будуць ахоплены ня толькі мужчыны, але ў аднолькавай меры і жанчыны.

Кіраўніцтва ваенізацыі жанчын ажыцьцяўляюць сэкцыі «вайсковай падрыхтоўкі працоўных жанчын» (ВТЖ), існуючыя пры цэнтральным і акруговых Саветах ТДА-Авіяхіму. Сэкцыі (ВТЖ) ставяць сваёй практычнай задачай ўцягваньне жанчын у шэрагі ТДА-Авіяхіму, стварэньне ў Таварыстве жаночага актыву, навучаньне жанчын вайсковай справе, падрыхтоўку з іх актыўных удзельнікаў абароны краіны, як для фронту, так і для тылу.

У гэтых адносінах у нас ужо маецца шэраг дасягненьняў. Жанчыны ўжо прымаюць удзел у працы выбарчых органаў ва ўсіх ячэйках Таварыства. Усё больш жанчын уцягваюцца ў вайсковыя і стралковыя гурткі, павялічваецца зацікаўленасьць гэтай справай. Жанчыны прымаюць актыўны ўдзел у розных спаборніцтвах. На стралковых спаборніцтвах Менску жанчына заняла першае месца пасьля вайсковых. У Віцебску т. Муратава атрымала першы прыз за стральбу.

Да Міжнароднага Дню работніц па ўсіх акругах БССР прыстасавана адчыненьне 6 месячных жаночых курсаў сувязі, з 2-ма аддзяленьнямі—тэлефонным і тэлеграфным.

8-га сакавіка арганізуецца сетка гурткоў паветрана-хімічнай абароны пры Акрсаветах і ЖАКТ'ах, разьлічаных пераважна на жанчын.

У Полацку да сьвята прыстасоўваецца арганізацыя стралковай жаночай каманды.

Праца на ваенізацыі жанчын ста-

І дзяўчаты не адстаюць.

іць на шляху разьвіцьця. Трэба яе пашырыць і паглыбіць.

У шэрагах ТДА-Авіяхіму БССР налічваецца каля 17.000 жанчын. Гэта ўжо некаторае дасягненьне.

Сьвяткаваньне 8 сакавіка павінна адбыцца пад лёзунгам уцягваньня працоўных жанчын у члены ТДА-Авіяхіму, павялічэньня жаночага актыву, уцягваньня іх у працу практычных арганізацый.

Жанчына, бліжэй да працы па абароне краіны.

Папова.

Вясковыя дзяўчаты не адстаюць.

„Калі ваенізавацца, дык усім, няўжо-ж мы горшыя".

(Новасёлкаўскі гурток вайсковых ведаў, Пухавіцкага раёну).

З сьнежня месяца мінулага году пры Новасёлкаўскай хаце-чытальні працуе вайсковы гурток, арганізаваны начскладам вучпункту з мясцовай моладзі. Гуртком вывучаецца, апрача спэцыяльных вайсковых ведаў, гісторыя Чырвонай арміі, галоўныя перыяды грамадзянскай вайны. Заняткі праводзяцца адзін раз у тыдзень. Падручнікаў для заняткаў гуртка і настаўнікаў вайсковай літаратуры ў мясцовай бібліятэцы ёсьць досыць. Стрэльбамі гурток карыстаецца пакавымі ў часе правядзеньня дапрызнадгатоўкі і кароткатэрміновых паверачных зборaў пераменнага складу. Так, нядаўна праводзілі збор перскладу; хутка пранесласа на вёсцы вестка аб заўтрашняй стральбе для сяброў вайсковага гуртка. Чуцьстала разьвіцьцца, хата-чытальня пачала запаўняцца моладзьдзю. Закінула праца: хто стрэльбы пранцірае, хто мішэні майструе, хто пучкі саломы для «упора» рыхтуе.

Толькі дзяўчата, вылучыўшыся ў асобную групу, ціснуліся адна за другую і паглядалі на стрэльбу. Скопчылася падрыхтоўка. Сябры гуртка рушылі на вуліцу.

— А нам дасьцё пастраляць?—запыталася пачырванеўшая дзяўчынка.

— У гуртку займаецеся?—пытае камандзір.

— Не,—адказамі хорам дзяўчата.

— Дык выбачайце, папярэдзе трэба навучыцца ўладаць стрэльбаю, яе пабіваць і прыцельвацца, а тады ўжо страляць.

— Калі ваенізавацца, дык усім, няўжо-ж мы горшыя: запішэйце і нас у гурток,—выказалі сваё пажаданьне дзяўчата.

Якуб.

Нашы задачы ў Міжнародны Жаночы Дзень.

10 год сьвяткуюць працоўныя пакрыны міжнароднае жаночае сьвята ў умовах волі, ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту, ва ўмовах асобных ад іншых краін. У краінах панаваньня капіталу камуністычныя партыі, пры прадзеньні Міжнароднага Дню ставяць сабе асноўнай задачай—мабілізацыю жаночых мас для барацьбы за ўладу, за дыктатуру пралетарыяту. У нашай краіне, поруч з міжнароднымі задачамі па ўмацненьню сувязі з рабочай клясай, з працоўнымі жаночымі масамі зарубежных краін, асноўным зьместам сьвята зьяўляецца максымальнае ўцягваньне шырокіх мас працоўных жанчын у агульную працу на абароне і сацыялістычнаму будаўніцтву краіны. Селета асноўнай задачай сьвята зьяўляецца, растлумачэньне сярод жаночых працоўных мас практычных задач, высунутых партыяй на 15-м партзьезьдзе.

У горадзе—пры правядзеньні кампаніі неабходна паставіць задачай уцягнуць работніц у працу па рацыяналізацыі вытворчасьці, па правядзеньню 7-гадзіннага рабочага дню і зьніжэньня сабекошту прадукцыі. Неабходна таксама ўцягнуць іншыя пласты працоўных жанчын гораду (жон рабочых, саматужніц) у грамадзкую працу галоўным чынам па лініі каапэрацыі і саветаў.

У вёсцы—асноўная ўвага шырокіх мас сялянак павінна быць зьвернута на задачы пасоўваньня вёскі да буйнай калектыўнай гаспадаркі, вытворчага каапэраваньня і згуртаваньня вакол партыі і саветаў бядняцка-батрацкага і серадняцкага актыву. Поруч з гэтым, як у горадзе, так і ў вёсцы стаяць задачы ўцягваньня найбольш падрыхтаваных работніц батрачак і бяднячак у партыю, узьняцьця культурна-палітычнага ўзроўню працоўных мас, задачы вызваленьня ад дадатковай хатняй працы аддагляду за дзецьмі.

Ня малае месца ў кампаніі да правядзеньня Міжнароднага Жаночага Дню займае задача вылучэньня работніц на больш адказную працу ў саветах, прафсаюзах, каапэрацыі, савецкіх і адміністрацыйных гаспадарчых установах.

Мы часамі не заўважваем нашых дасягненьняў, нам мала таго, што маем; нам яшчэ шмат чаго трэба дарабіць. Але ня працоўныя жанчыны савецкай краіны добра ведаем, што чым больш будзе ўзнімацца наша гаспадарка, разгортвацца наша тэхніка, расьці нашы багацьці, тым больш мы зможам будаваць устаноў, якія вызваляюць пралетарку ад дадатковай хатняй працы, ад клопатаў па аддагляду за дзецьмі.

У гэтай працы вялікае значэньне мае актыўны ўдзел, самадзейнасьць саміх жаночых працоўных мас па палепшаньні працы існуючых і па адчыненьні новых устаноў ня толькі за кошт дзяржавы, але і за кошт грамадзкіх арганізацый (саюзаў, каапэрацыі, камітэтаў сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі), за кошт збораў на гэту мэту сярод самога насельніцтва.

Вялікія кадры пралетарак уцягнуты намі ў грамадзкую працу. Мы маем 6376 работніц і служачых, праводзячых актыўную працу ў нізавых прафсаюзных органах; 2315 членаў саветаў.

Але шмат яшчэ трэба зрабіць для таго, каб працоўныя жанчыны занялі аднолькавы ўдзел на ўсёй працы па сацыялістычнаму будаўніцтву нашай краіны. Процант удзелу працоўных жанчын у працы прафесыянальных органаў, у працы саветаў і працы каапэрацыі ўсё яшчэ невялікі. Асабліва нізвачны гэты ўдзел у кіруючых органах. Вялікім тормазам на шляху пасоўваньня і вылучэньня працоўных жанчын на кіруючую працу зьяўляецца слабы культурны ўзровень шырокіх мас працоўных жанчын. Навот сярод работніц і сялянак, якія ўжо прымаюць актыўны ўдзел у працы, яшчэ ёсьць значны процант няпісьменных і малапісьменных. Вялікі процант няпісьменных мы маем і сярод дэлегатак. На кожную пісьменную сялянку прыпадае 2—3 няпісьменных і малапісьменных, якія ня могуць чытаць і пісаць. Таму, у Міжнародны Жаночы Камуністычны Дзень асабліваю ўвагу трэба зьвярнуць на задачу ліквідацыі няпісьменнасьці сярод шырокіх мас працоўных жанчын. Лезунгам дню павінна быць: «Ніводнай няпісьменнай грамадзкай работніцы, ніводнай няпісьменнай дэлегаткі».

У Міжнародны Жаночы Дзень шырокія масы працоўных жанчын павінны ўзмацніць свой удзел у абароне краіны. Працоўныя жанчыны паказалі, што яны ў ногу з усім пралетарыятам рыхтуюцца да актыўнай абароны нашай краіны. У шэрагах ТДА-Авіяхіму Чырвонага Крыжу ўцягнуты тысячы пралетарак БССР. Мы маем 25 пр. жанчын у шэрагах ТДА-Авіяхіму. У гурткох першай дапамогі Чырвонага Крыжу асноўны склад—працоўныя жанчыны. Але яшчэ ня ўсё зроблена. Трэба паляпшыць працу тых, хто ўжо ўцягнут у шэрагі абаронцаў нашай краіны, палепшыць якасьць іх падрыхтоўкі. Пашырыць лік працоўных жанчын, ахопленых гэтай працай. У Міжнародны Жаночы Дзень павялічым увагу да пытаньняў абароны.

У Міжнародны Жаночы Дзень работніцы, батрачкі і бядняцкія сялянкі павінны памятаць аб тым, што толькі пад кіраўніцтвам выпрабаванай у бойках, моцнай пытрымайай ленінскай камуністычнай партыі працоўныя атрымалі перамогу, пачалі будаваць новае жыцьцё, новую грамаду, у якой працоўныя жанчыны зьяўляюцца роўнапраўнымі яе будаўнікамі і абаронцамі. Лепшыя работніцы, батрачкі і бядняцкія сялянкі павінны ўліцца ў шэрагі партыі, уся маса працоўных жанчын павінна згуртавацца жалезнай сьцяной вакол яе.

КРЭМЭР.

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

КРЭДЫТАВАНЬНЕ ЖЫЛЬЛЁВАГА БУДАЎНІЦТВА.

Гомель, 7-3. Рабочы банк у гэтым годзе выключае для крэдытаваньня на жыльлёвае будаўніцтва з свіх сродкаў 120 тысяч рублёў. З іх 80 тысяч рублёў на крэдытаваньне жыльлёвай каапэрацыі і 40 тысяч рублёў на індывідуальнае будаўніцтва.

У першую чаргу крэдыты будуць выдадзены нанова арганізаваным Жактам, а таксама і тым, у якіх у мінулым годзе не рабілі рамонту. У адносінах да індывідуальнага крэдытаваньня Рабочы Банк узьнімае пытаньне аб выдачы больш буйных крэдытных пазык, якія маглі-б даць больш значны эфэкт у пашырэньні жыльлёвай плошчы.

ЗБОР ПАЁЎ.

Полацак, 7-3. З пачатку кампаніі на 1 сакавіка сабрана 47090 р. паявога капіталу. За апошніх 10 дзён сабрана 9874 р. За нядбайнасьць да збору паявых узносаў праўленьні трох спажывецкіх таварыстваў атрымалі выгавар.

САНІТАРНАЕ АБСЛУГОЎВАНЬНЕ ВЁСАК.

Падрыхтоўка санітарных дактароў для райёнаў скончана. Апошнія накіраваны на працу ў вёскі. Усяго сёлета на райёнах БССР працуюць 24 санітарныя дактары.

ТЭМП ЗАГАТОВАК АСЛАБЕЎ.

Лагойск, 2-III. Мясцовае спажывецкае таварыства за апошнюю дэкаду лютага сабрала паявых узносаў 414 р. Загатоўка крыху аслабела. Загатоўлена за гэты час хлеба ўсяго каля 140 пуд., скураной сыравіны толькі на 100 руб.

ПРЫКЛАДНЫ СТАРШЫНЯ СЕЛЬСАВЕТУ.

Коханава. Гальцэўскі сельсавет да 28 лютага выканаў с.-г. падатак на ўсе 100 проц. У працягу ўсяе кампаніі па с.-с. ня складзена ніводнага вопісу маемасьці. Старшыня сельсавету т. Анішчанка малапісьменны, селянін, бядняк, вылучэнец, сябра партыі, працуе шосты год у сваім сельсавеце, здолеў выканаць даручанае яму заданьне.

Коханаўскі РВК узьняў хадайніцтва аб выдачы т. Анішчанку ўзнагароды.

ЦЯГА Ў ПАРТЫЮ.

Гомель, 7-3. Да дню 8 сакавіка на шмат якіх прадпрыёмствах работніцы падаюць заявы аб прыёме ў партыю. У Новабеліцкім райёне падалі заявы 15 работніц. У гарадзкім райёне падалі 8 работніц.

5720 РУБ. НА АГНЯТРЫВАЛАЕ БУДАЎНІЦТВА.

Гомель, 5-3. Атрымана з Белсельбанку 5720 руб. доўгатэрміновага крэдыту спэцыяльна на пашырэньне агнятрывалага будаўніцтва, якое ў параўнаньні з мінулымі гадамі значна пашырылася.

Эпідэмія шкарлятыны.

Барысаў, 2-III. У Нова-Барысаве эпідэмія шкарлятыны і водры прыняла надзвычайна шырокія разьмеры. Усе школы сацвыху зачынены. Маецца шмат выпадкаў сьмерці дзяцей. Эпідэмія перакінулася і на г. Барысаў. Зарэгістравана больш 50 хворых і на г. Барысаву. Магчыма спыненьне заняткаў і ў горадзе.

Неабходны тэрміновыя мерапрыёмствы для спыненьня далейшага пашырэньня эпідэміі.

АБ КАНТРАКТАЦЫІ ПРАМЫСЛОВЫХ КУЛЬТУР У 1928 г.

(З пасяджэньня Эканамічнай Нарады за 5 сакавіка г. г.).

Кантрактацыя пасеваў лёну ў 1927 годзе сябе апраўдала. Яна забясьпечвае прамысловасьць патрэбнай сыравінай, а селянства—збытам прадукцыі і дастаўляе яму неабходныя сродкі. Эканамічная Нарада пастанавіла працягнуць на 1928 г. кантрактацыю пасеваў прамысловых культур. (Кантрактацыяй называецца заключэньне кантрактаў на пастаўку селянствам прадукцыі сваёй гаспадаркі).

У 1928 г. разьмеры кантрактацыі пасеваў прамысловых культур у БССР значна пашыраюцца.

Так, мяркуецца закантрактаваць лёну-валакна на плошчы 20 тыс. гэктараў, з т. варным выхадам валакна ў 43,4 тыс. цэнтнэраў (каля 260 тыс. пуд.); семе лёну — 10 тыс. гэкт., з выхадам прадукцыі ў 18,3 тыс. цэнт. (110 тыс. пуд.); сушэны—6,5 т. гэкт., з таварным выхадам каля 300 т. цэнт. (1,8 млн. пуд.) і піваварнага ячменю —3 тыс. гэкт., з выхадам каля 15 т. цэнт. (90 тыс. пуд.) прадукцыі.

Разьмеркаваньне пасеўнай плошчы, якая падлягае кантрактацыі, робіцца ў адпаведнасьці з райёнамі прамысловага распаўсюджаньня гэтых культур і з перспэктывамі разьвіцьця сельскай гаспадаркі ў гэтых райёнах. Па акругах гэтую плошчу разьмяркоўвае НК Гандлю па ўзгадненьні з НК Земляробства, Белсельсаюзам, Белсельбанкам і зацікаўленай прамысловасьцю.

Эканамічная Нарада ўстанавіла наступныя разьмеры авансаваньня кантрактацыі: бядняцкія гаспадаркі, якія карыстаюцца льготамі на сельска-гаспадарчым падатку, або ня маюць уласнай рабочай жывёлы ці інвэнтару для правядзеньня пасеваў, а таксама і калектыўныя гаспадаркі будуць атрымоўваць, як задатак уперад: па лёна-валакну—30 р. на гэктар, па лёну-сэмю—12 р. на гэктар, па бульбе—40 руб. на гэктар і па піваварным ячменю—19 р. на гэктар; серадняцкія гаспадаркі па лёна-валакну—27 р. на гэктар, па лёна-сэмю—10 р. на гэктар, бульбе—35 р. на гэктар і ячменю—16 р. на гэктар і, урэшце, заможныя: па лёна-валакну—23 р. на гэктар, бульбе—30 руб., лёна-сэмю — 8 р. і ячменю—13 р. на гэктар. Найменшы разьмер кантрактуемай плошчы—1/6 гэктара.

Каб больш пасьпяхова правесьці агрыкультурныя мерапрыёмствы, накіраваныя да павялічэньня ўраджайнасьці прамысловых культур, кантрактацыя пасеваў будзе рабіцца пераважна гнёздамі, г. зн., кантрактацыяй будуць ахапляцца цэлыя пасяленьні.

Для большай пасьпяховасьці ў правядзеньні кантрактацыі пасеваў сярод селян, якія кантрактуюць свае пасевы, будзе ў першую чаргу разьмяркоўвацца палепшаны насенны матар'ял, штучныя ўгнаеньні, сельска-гаспадарчыя машыны і прылады, а таксама ім даецца пераважнае права на атрыманьне крэдытаў для набыцьця сельска-гаспадарчага інвэнтару, штучнага ўгнаеньня і палепшанага насеньня, з захаваньнем сыстэмы крэдытаваньня селянскіх гаспадарак па іх сацыяльным становішчы.

Звыш таго, Эканамічная Нарада прызнала неабходным дастаўляць у першую чаргу здатчыкам лёну-валакна мануфактуру, а ў райёнах з недахватам хлеба дастаўляць ім хлеб у разьмеры каштоўнасьці здадзенага валакна, але ня звыш спажывецкіх патрэб данай гаспадаркі.

Каб забясьпечыць закантрактаваўшых свае пасевы палепшаным матар'ялам, ім будзе рабіцца водпуск насеньня лёну-даўгавцу, бульбы і піваварнага ячменю, прычым водпуск насеньня будзе рабіцца па самых танных цэнах, магчыма, ніжэй сабекошту.

Агульнае кіраваньне правядзеньнем кантрактацыі пасеваў ускладаецца на НК Гандлю, а кантрактацыя па лёну і ячменю праводзіцца, як правіла, праз сыстэму сельска-гаспадарчае каапэрацыі, каб больш шчыльна ўвязаць дастаўку і збыт селянскіх гаспадарак.

Выдача авансаў будзе рабіцца: 75 проц. пры падпісаньні дагавору і 25 проц. пасьля праверкі пасеваў, але ва ўсякім выпадку не пазьней 1-га чэрвеня.

Гэтая выдача робіцца як грашыма, так і пасенным пасяўным матар'ялам і выдаецца бяспроцантна.

Тэрміны здачы пастаўшчыкамі прадуктаў устанаўляюцца наступныя: для валакна лёну: лістапад—35 проц., сьнежань—40 проц. і студзень—25 проц.; семе лёну і бульбы: у кастрычніку і лістападзе—па 50 проц., для ячменю—ў кастрычніку—30 проц., лістападзе—40 проц. і сьнежні—30 проц.

Для разрахунку з пастаўшчыкамі за закантрактаваныя прадукты ўстанаўляюцца наступныя цэны: лён-валакно—існуючыя цэны гэтага году, семе лёну—2 кап. з пудапроцанту дабротнасьці, для бульбы ня ніжэй 28 кап. і для піваварнага ячменю—1 руб. 25 кап. за пуд.

Такім чынам, пры кантрактацыі пасеваў селянства ня толькі атрымлівае наперад грошы, але таксама і забясьпечвае сабе збыт па ўстаноўленых цэнах.

Каб устанавіць паўны парадак у здачы сыравіны, у выпадку, калі селянін не засеяў паказанай у дагаворы плошчы, ён павінен да тэрміну зьвярнуць аванс з налічэньнем 12 проц. гадавых за час карыстаньня крэдытам і, апроч таго, за напясеньне ўбыткаў дзяржаве падлягае адказнасьці. У выпадку стыхійнага няшчасьця пасеўшчык аслабяняецца ад уплаты няўстойкі і за аванс плаціць толькі 6 проц.

Апроч таго, Эканамічная Нарада пастанавіла прасіць НК Гандлю СССР аб вылучэньні спэцыяльнага фонду для БССР у разьмеры: жыта—1.500 вагонаў і мануфактуры—50 вагонаў, а таксама даручыла НК Земляробства прадугледзіць у плане дастаўкі лясных матар'ялаў сельскаму насяленьню дастаўку іх селянам, якія кантрактуюць свае пасевы.

У прыватнасьці, Белсельбанку запрапанавана крэдытаваць апэрацыі па закупцы каапэрацыяй на корані ўраджаю яблык у калектыўных гаспадарках і садова-гародных таварыствах.

На 15-цірублёвы пай.

Гомель, 3-III. Скончылася справаздачна-перавыбарчая кампанія ЦРК. 7800 чал. абгаварвалі працу ЦРК. Пайшчыкі выявілі вялікую актыўнасьць.

Кожны пайшчык, лічачы сябе гаспадаром, адзначыў недахваты і разам улічыў і адказнасьць за пастаноўку працы свайго каапэратыву.

Пайшчыкі адзначылі недахваты, галоўным чынам, у гандлёва-загатоўчых апэрацыях. Не абышлі пытаньня ўзаемаадносін прадаўцоў і пакупнікоў. Адзначалі выпадкі грубых адносін прадаўцоў але бывалі выпадкі незаслужанае абразы прадаўца.

Пайшчыкі прапанову аб 15 руб. узносе прынялі цалкам.

Былі прапановы аб пашырэньні гандлёвай сеткі, аб пераразьмеркаваньні гадзін працы асобных магазынаў, каб лепш абслужыць пайшчыкаў.

У новы склад упаўнаважаных абрана 195 чал., з якіх 73 кандыдаты.

Выбрана 38 каапэрацыйна-крамных камісій, у склад якіх увайшло 219 ч. Яшчэ па калектывах трэба выбраць 10 крамных камісій.

З сакавіка адбудзецца чаргозны сход упаўнаважаных новага складу.

СЯЛЯНКА ПАВІННА ЎЗЬНЯЦЬ БУНТ СУПРОЦЬ ТРОХПАЛЁУКІ І ДЗЕДАЎСКІХ МЭТАДАЎ ГАСПАДАРАНЬНЯ.

Гутарка з Нар. Кам. Земляробства тав. Прышчэпавым.

Мы ў сельскай гаспадарцы перасягнулі даваенны ўзровень. Перад бядняцкімі і серадняцкімі масамі вёскі стаіць вялікая задача—пановаму перабудаваць нашу сельскую гаспадарку.

Што павінна рабіць селянка ў сёлетнюю сельска - гаспадарчую кампанію?

БЯДНЯЦКІЯ ГАСПАДАРКІ—Ў КАЛЕКТЫВЫ.

Пры дробным землякарыстаньні надзвычайна цяжка палепшыць сельскую гаспадарку, пагэтаму сёлета неабходна будзе перад селянкамі паставіць задачу аб **калектывізацыі сельскай гаспадаркі.** Практыка тых калектыўных гаспадарак, якія да гэтага часу існуюць, паказала, што тым беднякам, якія даўно аб'ядналіся ў калхозы лепш жывецца, чымся беднякам, якія засталіся весьці індывідуальную гаспадарку і цяпер цэлы шэраг іх ня мае часам каня, плуга, насеньня і іншага. А калі і здабывае бядняк інвэнтар, дык яму трудна ўтрымаць яго пры малазямельні, пагэтаму выхадам да лепшага жыцьця павінен зьявіцца пераход да калхозаў. Перад селянкай такая задача павінна быць пастаўлена як аснаўная.

АЧЫСТКА НАСЕННАГА МАТАР'ЯЛУ.

Паставіць у гаспадарцы задачу ачысьціць к яравому севу ўвесь насенны матар'ял. Дзеля гэтага на пракатных пунктах, савхозах, калхозах і каапэрацыйных таварыствах ёсьць належныя машыны, прылады. Селянка павінна ведаць, што лепш засеяць меньш добрага насеньня, чымся засеяць шмат, але-ж пустога, якое ніякага ўраджаю ня дасьць. Калі селянін сее неачышчанае, пустое насеньне, ён абманвае сябе і сям'ю на цэлы год. Пасьля ачысткі, калі свайго насеньня мала магчыма атрымаць крэдыт і купіць неабходнае насеньне збожжа, альбо бульбы, вікі і іншых культур.

ШТУЧНАЕ ЎГНАЕНЬНЕ ЗЯМЛІ.

У нашага селянства не хапае ўгнаеньня, пагэтаму ў нас такія слабыя ўраджаі. Як галодная карова ня можа даваць добрага ўдою, так і галодная зямля ня будзе даваць добрага ўраджаю. У серадняцкіх і асабліва ў бядняцкіх гаспадарках свайго гною не хапае, пагэтаму трэба праз крэдыт, а ён адпушчаецца, трэба прыкупіць штучнага ўгнаеньня і калі зямлю ўгнаіць, дык яна дасьць добры ўраджай.

ПЕРАЙСЬЦІ НА ШМАТПОЛЬЛЕ.

Там, дзе праведзена земляўпарадкаваньне і там, дзе яна праводзіцца, селянкі павінны ставіць пытаньне аб пераходзе на шматпольле замест трохпольля. **Селянкам пара падняць бунт супроць трохполкі.** Якое гэта жыцьцё ў бядняцкай і серадняцкай сям'і на трохполцы, калі сям'я (асабліва ў бедняка) не дае і селянцы больш, чымся каму бы ні было прыходзіцца адчуваць. Пераарабіць гаспадарку прыбытковай і дзеля гэтага пераходзіць на шматпольле. Вожны аграном пакажа селянству, як перайсьці на шматпольле, толькі трэба гэтага захацець, і кожны селянін паставіць гаспадарку пановаму.

ЧАМУ ГАЛАДУЕ НАША ЖЫВЁЛА?

Каму больш, як не селянцы, прыходзіцца клапаціцца аб жывёле—каровах, сьвіньях, птушках. А ў нашага, асабліва бядняцкага селянства каровам, сьвіньням, птушкам прыходзіцца галадаваць ня менш, чымся самому селяніну. Зразумела, што ад такой жывёлы ніякага ня можа быць прыбытку. У селяніна жывёла мучаецца. У нас, напрыклад, у Беларусі ў тых райёнах, дзе няма лясных выпасаў—і летам селянская жывёла галодная. Што павінна зрабіць селянка? Дабіцца таго, каб у гаспадарцы разам з палепшаньнем сенажацяў **уводзіўся палявы травасеў,—канюшыны, вікі, серадэлі і больш за ўсяго кожная селянка павінна дабіцца ў сваёй гаспадарцы пасеву кармавых карняплодаў (кармавых буракоў, турнэпсу, моркві).**

Калі за межамі добра карову кормяць, дык там адна карова ў год дае 200 вёдзер малака, а ў нас у Беларусі толькі 56 вёдзер.

Кожная беларуская селянка павінна дабіцца таго, каб яе карова давала ня менш 100 вёдзер малака ў год, дзеля гэтага трэба вырашчваць у гаспадарцы неабходныя кармы—сеяць канюшыну, віку, серадэлю, кармавыя карняплоды.

ЗНАЧЭНЬНЕ ГАРОДНІЦТВА ПРЫ НАШЫМ МАЛАЗЯМЕЛЬЛІ.

У нас у бядняцка-серадняцкіх гаспадарках яшчэ надзвычайна кепска паставлена справа з гароднічтвам. У селянства не хапае прадуктаў гароднічтва і садоўніцтва, тым часам, як пры нашым малазямельлі мы павінны арганізаваць высока інтэнсыўную сельскую гаспадарку, у якой бы гэта галіна займала адно з відных месц і такімі прадуктамі селянства ня толькі павінна сябе здавальняць, але-ж і мець шмат гэтай прадукцыі на продаж і вываз.

Нашы селянкі не навучыліся яшчэ арганізоўваць такое інтэнсыўнае і таварнае гароднічтва, дзеля гэтага неабходна ў кожным райёне арганізаваць хоць бы адзін паказальны гарод і сад, на якіх селянкі мелі-б магчымасьць на практыцы ўбачыць, як такія гароды арганізаваць у сваёй гаспадарцы. Такі паказальны прыклад тым больш мае асаблівае значэньне таму, што цяпер пры земляўпарадкаваньні мы адводзім селянству шырокія сялібы, ня менш гэктару, і кожны земляўпарадкаваны двор мае магчымасьць арганізаваць досыць вялікі гарод.

НЕАБХОДНА НАЛАДЗІЦЬ ПТУШКАГАДОЎЛЮ.

Намі нічога ня зроблена па развядзіцьці птушкагадоўлі і вывазу птушак, яец за межы, а між тым пры нашым досыць значным аграрным беспрацоўі жаночую працу магчыма скарыстаць у галіне птушкагадоўлі. У Даніі мне прыходзілася бачыць гаспадаркі прыблізна ў 5 дзесяцін, якія ад продажу курыных яец зарабляюць 360 руб. у год, гэта раўняецца прыблізна гадавому заробку нашага настаўніка. Такога прыбытку ад птушкагадоўлі можа дабіцца кожная наша гаспадарка толькі трэба ўмеючы паставіць справу і завесьці племянных птушак. Дзеля падрыхтоўкі з саміх жанчын добрых працаўнікоў па птушкагадоўлі мы ў сёлетнім годзе думаем арганізаваць курсы прыблізна на 60 жанчын, якія пасьля сканчэньня іх павінны зьявіцца арганізатарамі гэтае справы на вёсцы.

Практычныя мерапрыемствы да сяўбы.

С.-гасп. машын і ўгнаеньня загатоўлена 85 проц. заданьня. Рознага насеньня загатоўлена каля 700.000 пудоў. У сёлетнюю кампанію будзе ачышчана 25 проц. усяго насеннага матар'ялу. Будуць выкарыстаны ўсе фонды каапэраваньня для ўцягненьня беднаты ў вытворчыя аб'яднаньні.

Падрыхтоўка Белсельсаюза да вясеньняй пасеўнай кампаніі праводзіцца пад лёзунгам узмацненьня вытворчасьці сельскай гаспадаркі, павышэньня маемаснага становішча беднаты і пашырэньня каапэраваньня і калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Для ажыцьцяўленьня гэтых лёзунгаў Белсельсаюз, папершае, прыняў меры да забясьпечаньня селянства с.-гасп. машынамі, насеньнем і штучным угнаеньнем.

Што-ж зроблена ў гэтай галіне?

Плян па загатоўцы с.-гасп. машын і ўгнаеньня выкананы на 85 проц.

Дагэтуль Белсельсаюз загатовіў досыць значную колькасьць с.-гаспадарчых машын; **загатоўлена плугоў 34276 шт., ці заданьне выканана на 85 пр.; барон—2486 шт., што складае 48 пр. заданьня; сеялак — 234 шт., ці 100 проц. заданьня; веялак—4866 шт., ці 99 проц. вызначанага для загатоўкі; плян па загатоўцы сарціровак выканан на 120 проц.,—загатоўлена іх 296 шт.; загатоўлена таксама 97 трыераў і 16 трактараў.**

Трэба адзначыць, што ў сувязі з скарачэньнем імпорту сёлета ня будзе выкананы плян па загатоўцы пружынавых барон—на 50 проц. і на спэцыяльныя машыны, як сеялка «Планет»—на 50 проц.

Штучнага ўгнаеньня дагэтуль загатоўлена: супэрфасфату 3675 тон, фосфарнай мукі—600 тон, калійнай солі—402 тоны і касьцяной мукі—80 тон. Наогул, плян па загатоўках штучнага ўгнаеньня выкананы на 85 проц., але да вясны ня будзе тамаслашку і касьцяной мукі.

Загатоўлена 11.405 тон рознага насеньня.

Па загатоўцы насеньня маем такі малюнак: канюшыны загатоўлена 435 тон, ці 140 проц. заданьня; цімафееўкі—45 тон—82 проц. заданьня; серадэлі — 94 тоны—75 проц. заданьня; вікі—847 тон, што дае выкананьне заданьня на 100 проц.; карвэлёдаў—33 тоны, ці 82 проц. заданьня; аўса загатоўлена 8150 тон—71,7 проц. заданьня; ячменю—988 тон—150 проц. заданьня; выкананa таксама заданьне на ўсе 100 проц. па загатоўцы лёну-даўгунца, якога загатоўлена 813 тон.

Пакуль што кепска стаіць справа з загатоўкай лубіну, бо загатоўка яго праводзіцца выключна ў межах БССР, а лубін ляжыць яшчэ ў селянства не малочаным.

Неабходна ўзмацніць мясцовыя загатоўкі насеньня.

Трэба сказаць, што сёлета, дзякуючы вялікаму попыту з боку селянства на насенны матар'ял, задаволіць усе патрэбы цэнтралізаванымі загатоўкамі Белсельсаюзу немагчыма. У сувязі з гэтым дадзены дырэктывы сыстэме сельска-гаспадарчай каапэрацыі прыняць рашучыя меры да ўзмацненьня мясцовых загатовак, галоўным чынам, вікі, лубіну, аўса і ячменю.

Падругое, прыняты меры да таго, каб усе машыны, насеньне і ўгнаеньне былі своячасова завезены па месцы. Апрача таго, нізоўцы дадзены дырэктывы своячасова атрымаць крэдыты для пасеўнай кампаніі і ў першую чаргу забясьпечыць сродкамі вытворчасьці патрэбы беднаты, калхозаў і пасёлкаў. Асаблівая ўвага зварачаецца на забясьпечаньне тых калхозаў, пасёлкаў і вёсак, якія ўвесну пераходзяць на шматпольле.

Шырока разгорнецца праца па каапэраваньню селянства.

Разам з тым у гэту пасеўную кампанію будзе шырока разгорнута праца па вытворчаму каапэраваньню. З мэтаю пашырэньня калектывізацыі сельскай гаспадаркі будзе ўстаноўлена для бедняцка-серадняцкіх аб'яднаньняў асабліва ільготныя ўмовы крэдытаваньня і прадажы сельска-гаспадарчых машын і прыладаў.

У працы калектыўных гаспадарак асаблівая ўвага будзе зьвернута на рацыянальную арганізацыю гаспадаркі:—перавод на шматпольле, павялічэньне плошчы пад інтэнсыўнымі культурамі і інш. Адначасова будзе весьціся праца па ўцягненьню селянства, пераважна беднаты ў існуючыя аб'яднаньні. Для гэтай мэты будуць скарыстаны ўсе фонды па каапэраваньню. Каапэраваньне будзе праводзіцца галоўным чынам у вытворчую каапэрацыю.

Акрсельсаюзам дадзена заданьне зараз-жа прыступіць да арганізацыі машынных таварыстваў, забясьпечыць іх належнай колькасьцю машын. У першую чаргу гэтым таварыствам будуць дадзены машыны па ачыстцы насеньня і прылады для апрацоўкі глебы.

Будзе ачышчана 25 проц. пасеўнага матар'ялу.

Побач з гэтым будзе шырока разгорнута праца на ачыстцы насеньня праз машынныя таварыствы, калхозы, сельска-гаспадарчыя крэдытныя таварыствы і інш. арганізацыі. Сёлета мяркуецца прапусьціць праз ачыстку ня менш 25 проц. усяго насеннага матар'ялу селянскіх гаспадарак.

Дапамога калхозаў селянству.

Нашыя калхозы ў час пасеўнай кампаніі разгорнуць шырокую працу ў ваколічных вёсках: яны правядуць ачыстку насеньня, абменяць селянам іх звычайнае зярно на сваё палепшанае (вядома, пасьля здавальненьня сваёй патрэбы); дадуць на пракат плугі, бароны і іншыя сельска-гаспадарчыя машыны і дарэмна дапамагуць беднаце цягавай сілай для апрацоўкі глебы. Апрача таго, калхозы будуць прадстаўляць селянам для злучкі сваіх вытворцаў.

ЗАГАТОЎКА ХЛЕБА І СЫРАВІНЫ.

Загатоўкі за 3-ю дэкаду лютага.

(Полацкая акруга).

За апошнюю дэкаду лютага ў Полаччыне загатоўкі некаторых відаў сыравіны ішлі здавальняюча.

Спажывецкая каапэрацыя за гэты час загатовіла: жыта—16 тон, ячменю—7 тон, аўса—9 тон, вікі—10 тон, шчаціны—на 571 руб., пушніны—на 658 руб., скураной сыравіны буйнай—на 1542 руб., дробнай—на 8160 р., мяса і жывёлы—на 8028 р., рызьля—7 тон і інш. відаў сыравіны—на 856 руб.

Хлебапрадукт загатовіў 17132 клгр. рознага збожжа і 943 клгр. семя лёну.

Полацкае **агэнцтва Дзяржгандлю** розной сыравіны загатовіла на суму 16632 руб., у гэтым ліку валакна лёну—на 12613 руб., шчаціны—на 1063 руб. і пушніны на 1350 руб.

Апарат **скурсындыкату** загатовіў 43 шт. буйных скур, 2056 шт. апоек і 119 штук аўчын.

Сельсаюзам з пачатку кампаніі загатоўлена: валакна лёну—522 тоны, на 187694 руб., семя лёну—693 тоны на 80625 руб., розных хлебных прадуктаў—251 тону, скураной сыравіны—на 29693 руб., мяса—на 42583 руб., пушніны—на 15572 руб. і шчаціны—на 14865 руб.

Маглі быць дасягненьні большыя.

(Віцебская акруга).

Нельга сказаць, каб загатоўкі ў лютым праходзілі ўдала па ўсіх відах сыравіны.

Так, жыта, аўса, ячменю ды іншых збожжапрадуктаў загатоўлена толькі 39 проц. заданьня на люты, што зьяўляецца далёка невыстарчальным.

Яшчэ горш ішла загатоўка семя лёну, заданьне па якім выканала толькі на 8,5 проц.

Слаба вялася і загатоўка валакна лёну: месячнае заданьне па гэтай сыравіне выканана ўсяго на 22,4 проц.

Больш пасьпяхова загатаўлялася скураная сыравіна. Усім загатоўчым арганізацыям было заданьне загатовіць 7144 шт. буйнай скураной сыравіны, фактычна загатоўлена 4186 штук, што складае 67,4 процантаў заданьня.

Гэткі-ж малюнак і ў загатоўцы шчаціны (выканана 68,8 проц.) і пушніны (52,5 проц.).

Амаль поўнасьцю выпанан плян загатоўкі конскага воласу (92,8 проц. заданьня).

Асабліва пасьпешна праходзіла загатоўка дробнай скураной сыравіны і мяса: дробная скураная сыравіна загатоўлена на 131,7 проц., а мяса —на 148,2 процанты месячнага заданьня.

Захады да павялічэньня засеву лёну.

Калегія НК РСІ, абсьледаваўшы становішча ільнаводства і ільнаводнай прамысловасьці, вызначыла канкрэтныя мерапрыёмствы да палепшаньня і пашырэньня ільнаводства.

НКГ Сораў і Наркамзему даручана ў наступным годзе пераглядзець у ільнаводных райёнах скідкі па с.-г. падатку.

Наркамземляробства праз с.-г. каапэрацыю павінен будзе забясьпечыць ільнаводныя райёны насеньнем лёну, а таксама прыняць меры да павялічэньня колькасьці насенных матар'ялаў высокіх гатункаў і закладкі паказальных селянскіх вучасткаў з засевам лёну.

Для забясьпечаньня больш хуткай апрацоўкі лёну НК РСІ загадаў НКЗему дадаткова адпусьціць на кожную дзесяціну лёну чвэрць куб. саж. дроў для сушкі лёну, а ў малалесных райёнах узмацніць торфараспрапоўкі.

НК РСІ даў таксама адпаведныя ўказаньні аб паляпшаньні ільняной прамысловасьці і поўным забясьпечаньні яе сыравінай.

Як праходзіць рэалізацыя пазыкі.

Тэмп нармальным лічыць нельга.

АЗЕРЫШЧА, 7-3. Рэалізацыя селянскай пазыкі ў нашым сельсавеце пасоўваецца наперад. Так, з 1 да 7 сакавіка прадалі аблігацый пазыкі на 850 руб., а з пачатку кампаніі—на 1250 руб. Усё-ж тэмп рэалізацыі прызнаць нармальным нельга.

Магілеўшчына рэалізавала толькі 20 проц. заданьня.

(Ад уласн. кар-та).

Да 1-га сакавіка ў Магілеўскай акрузе рэалізавана пазыкі ўзмацненьня селянскай гаспадаркі на 89467 руб., ці выкананa 20 проц. заданьня.

Асобныя райёны далі наступныя сумы: Крычаўскі—8599 р., Кармянскі—7040 руб., Прапойскі—4635 руб., Касьцюковіцкі—6700 руб., Журавіцкі—2630 руб., Клімавіцкі—5993 руб., Быхаўскі—5400 руб., Чачэвіцкі—1725 р., Магілеўскі—5070 руб., Шклоўскі—3100 руб. Чэрыкаўскі—2187 руб., Бялыніцкі—2600 руб., Чавускі—2480 руб., Хоцімскі—1590 руб., Луналаўскі—2796 руб. і Краснапольскі—1610 руб.

Гарадзкія контрагэнты распаўсюдзілі аблігацый пазыкі на 3787 руб., вайсковыя часьці—на 21450 руб.

Працу яшчэ не разгарнулі належна.

(Рагачэўскі райён).

Да 25 лютага ў Рагачэўскім райёне распаўсюджана аблігацый пазыкі ўзмацненьня селянскай гаспадаркі на 16962 руб. Значна дапамагае распаўсюджваньню пазыкі тое, што ў апошні час пачалі практыкаваць абход асобных селянскіх двароў і праводзіць гутаркі аб значэньні селянскай пазыкі з паасобнымі селянамі. Шэраг вёсак купілі аблігацыі на кожны двор.

Але яшчэ і дасюль некаторыя працаўнікі і ўстановы слаба вядуць працу па распаўсюджваньні пазыкі. Гэтым асабліва вызначаюцца амаль усе калектыўныя гаспадаркі; слаба дзейнічае і Гарадзецкае лясьніцтва, якое рэалізавала аблігацый толькі на 30 р.

Ёсьць выпадкі, што некаторыя працаўнікі, як, напрыклад, старшыня сматужвіцкага т-ва Рыбкін, трымаюць аблігацыі ў сябе ў кішэні і вічога ня робяць для іх распаўсюджваньня.

На процантныя адлічэньні ад рэалізацыі пазыкі ў райёне мяркуецца правесьці наступнае: дабудаваць больніцу, устанавіць гучнагаварыцель, пабудаваць вэтэрынарны пункт і пяць калодзежаў, устанавіць тэлефонную сувязь з пяцьцю сельсаветамі, купіць некалькі с.-г. машын і кіно-перасоўку.

Усе гэтыя мерапрыёмствы магчыма будзе ажыцьцёвіць толькі тады, калі мясцовыя ўстановы шырэй разгорнуць працу па распаўсюджваньні пазыкі.

Вёска на шляху калектывізацыі.

Шырэй дарогу калектывам.

АРШАНСКАЯ ВЁСКА ІМКНЕЦЦА ДА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ. ПЕРАШКОДЫ, ЯКІЯ СТАЯЦЬ НА ШЛЯХУ АРГАНІЗАЦЫІ КАЛЕКТЫЎНАЕ ГАСПАДАРКІ, ПАВІННЫ БЫЦЬ РАШУЧА ЗЬНІШЧАНЫ

XV партыйны зьезд зварухнуў шырокія масы працоўнага бядняцкага сялянства Аршаншчыны, даўшы дырэктыву аб калектывізацыі вёскі.

Сяляне самі сталі агітаваць за новыя формы гаспадаркі, за паляпшэньне свайго эканамічнага становішча, да якога вядзе новае землякарыстаньне—КАЛЕКТЫЎНАЕ.

Прыкладам гэтага могуць быць сяляне-беднякі в. в. БАРОДНІКАВА і КАШЫНА (Аршанскі р.) ЯКІЯ НА АГУЛЬНЫХ СЕЛЬСКІХ СХОДАХ пастанавілі зараз-жа арганізаваць камуны, скласьці ўсю маемасьць у адну агульную. Гэта пастанова пачынае ўжо ажыцьцяўляцца.

Былыя батракі маёнтку ЯРЫНАВА У КОЛЬКАСЬЦІ 13 ГАСПАДАРОЎ, на агульным сходзе пастанавілі арганізаваць сельска-гаспадарчую арцель.

Да арганізацыі пастанавілі прыступіць зараз-жа,—перадаць усю сваю маемасьць і жывёлу ў агульнае карыстаньне.

У ЗАГВАЗЬДЗІНСКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ (Дубровенскага райёну) селянства на агульным сходзе выказалася, што хутарское землякарыстаньне—самая кепская і адсталая форма землякарыстаньня, што самая лепшая з форм культурнага землякарыстаньня—арцелі, калектывы і камуны.

13 ВЁСАК АРШАНСКАГА РАЙЁНУ, якія раскінуты ў наступных сельсаветах: Бразьдзечанскім, Межаўскім, Рудкоўскім, Пугляёўскім і Баранскім далі сваю згоду перайсьці на новыя калектыўныя формы землякарыстаньня.

З боку кулакоў назіраюцца значныя перашкоды бяднейшай частцы селянства будаваць калектыўнае жыцьцё. Мала таго, што яны перашкаджаюць арганізацыі, але яны пагражаюць пабоямі, падпалам і інш.

Ёсьць факт. Селянін бядняк в. Слабодкі, Межаўскага сельсавету, Аршанскага райёну, тав. Кавяноўскі за тое, што прапанаваў на агульным сходзе арганізаваць з бядняцкай часткі селян камуну быў пабіты грам. Баркоўскім.

Назіраецца зацяжка са справамі па калектыўнаму землякарыстаньню ў АКРЗА. Былі выпадкі, калі цягнулася валакіта на працягу 4—5 месяцаў па афармленьню спраў.

Усе партыйцы, усе камсамольцы павінны прыняць самы шырокі і актыўны ўдзел у справе агітацыі за справу калектывізацыі і накіраваць імкненьні сялянства па правільным грунтоўным шляху. С.

Залажылі калектыўны гарод.

У мінулую восень закончана каморнікам праца па разьмеркаваньню запаснага фонду, перададзенага з падлеснае плошчы. Па гэтай плошчы пабудаваны 2 пасёлкі 30 гаспадароў. Гэта частка беззямельных грамадзян в. Вугалец, якія накінулі свае вузкія загоны для пашырэньня палосаў суседзяй а самі дабрахвотна пайшлі на пасёлкі. Такім чынам, наша вёска пашырыла сабе палосы, прарэзала будынкі і толькі ня зьвішчыла далёказямельле.

Тыя-ж 30 гаспадароў, што выйшлі на пасёлкі, лічаць сябе стала землеўпарадкаванымі і думаюць жыць і гаспадарыць пановаму. Асабліва вылучаецца пасёлак «Вясёлы Бораг», куды падабраліся ўсе, як іх вялічаюць «культурнікі». Яны і сапраўды заслугоўваюць гэтае званьне, вылучаючы імкненьне да культурнага вядзеньня гаспадарак. Напрыклад, яны ахвотна згадзіліся на прапанову землеўпарадкавацеля пабудавацца на горшай зямлі, а **кавалак лепшае зямлі вызначылі пад калектыўны гарод**, на якім будзе пад кіраўніцтвам агранома заведзен трохпалёвы гародны севазварот і ўстаноўлен плодазьмен гародных культур, кіруючыся не тыя культуры, якія ня толькі здавальняюць патрэбы гаспадаркі, але і даюць ёй прыбытак шляхам збыту на рынак.

Трэба дадаць, што ў нашым райёне гэта першы прыклад залажэньня калектыўнага гароду.

А дзеля гэтага пакладзены на гэты выпадак зьвярнуць асаблівую ўвагу, каб ён адыграў сваю ролю на шляху падняцьця занядбалага нашага гароднічтва. А. С.

*в.

ПАСЯЎНАЯ КАМПАНІЯ У СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫХ КАЛЁНІЯХ.

Управа месц зьняволеньня пры НК Унутраных Спраў распрацавала плян правядзеньня вясеньняй пасяўной кампаніі на сельска-гаспадарчых напраўных калёніях. Па пляну вызначаны і ўжо выкананы наступныя работы: адрамантаваны і працуюць машыны па ачыстцы насеньня; адсартавана і падрыхтавана насеньне да пасеву.

Вядзецца праца па азнаямленьні сялян-зьняволеных з важнасьцю пратраўліваньня насеньня, каб асьцерагчы яго ад грыбных хваробаў. Для сялян, якія жывуць недалёка ад с.-гаспадарчых калёній, даюцца машыны на ачыстцы насеньня, а ачыстка насеньня бяднейшым гаспадаркам робіцца бясплатна. У клюбах с.-гаспадарчых калёній вядуцца з сялянамі гутаркі на тэмы аб севах.

Згодна вытворчага пляну, яравы клін с.-гаспадарчых калёній сёлета павялічвецца на 30 проц. за рахунак апрацоўкі зямель, якія да гэтага часу адлягава і.

За рахунак скарачэньня пасеву зернавых культур павялічваецца пасеў кармавых траў і кораньплодаў.

Добра забясьпечаныя пасеўным матар'ялам і машынамі калёніі будуць дапамагаць сялянству ня толькі імі, але дадуць магчымую аграномічную дапамогу пры пераходзе на шматпольны севазварот і па арганізацыі паказальных вучасткаў.

Сельска-гаспадарчыя калёніі да гэтага часу выдалі сялянству 6000 пуд. насеньня. На азімы клін было адпушчана—3100 пуд. насеньня. Для бяднейшага сялянства бясплатна адрамантавана розных с.-гаспадарчых машын і прыладаў 211 штук. Бясплатна на пракат адпушчана 72 машыны.

Ва ўсіх акругах ёсьць 13 с.-гаспадарчых калёній, усе яны добра абсталяваны машынамі і прыладамі, маюць добрае насеньне і іх дапамога сялянству патрэбна і карысна. Гэта дапамога асабліва мае вялікае значэньне цяпер, у часе пасяўной кампаніі.

Страхавыя плацяжы павінны быць сабраны поўнасьцю.

АКРВЫКАНКОМЫ І РВК НЕ ВЫКАНАЛІ ДЫРЭКТЫЎ УРАДУ АБ ЗБОРЫ СТРАХОЎКІ.—НАЙГОРШ ПАСТУПАЕ СТРАХОЎКА Ў МАГІЛЕЎСКАЙ, АРШАНСКАЙ І ПОЛАЦКАЙ АКРУГАХ.

1 сакавіка скончыўся тэрмін збору страхавых плацяжоў, прычым акрвыканкомы і равіканкомы ня выканалі дырэктыў ураду аб зборы страхоўкі: і сакавіка паступіла ўсяго толькі 80 проц. належнага акладу. **Такім чынам, у недаборы—772566 р.**

Гэта лічба сьведчыць аб тым, што некаторыя РВК і нават акрвыканкомы нядбайна адносіліся да страхавой кампаніі.

Найгорш паступае страхоўка ў Магілёўскай акрузе, дзе ў недаборы—168075 руб. За Магілёўскай акругай ідзе Аршанская—у недаборы 112000 рублёў.

Полацкая акруга выпаўніла 76,6 проц. заданьня, Бабруйская—79,7 пр. і Гомельская—81,7 проц.

Некаторае палепшаньне ў зборы страхоўкі ёсьць у Менскай, Віцебскай і Мазырскай акругах, дзе процант выпаўненьня дасягае 85.

Як відаць, ніводная акруга поўнасьцю ня выканала страхавой кампаніі. Акрвыканкомы не прыцягнулі да адказнасьці амаль ніводнага працаўніка райёну.

Застаўся адзін выхад—прымусовае спагнаньне страхоўкі. На працягу сакавіка АВК і РВК павінны будуць прыняць усе меры да спагнаньня страхоўкі, **а тых, хто нядбайна адносіўся да збору страхоўкі, аддаць пад суд.**

Пабудова дзьвёх новых швэйных фабрык.

На ўчарашнім пасяджэньні Прампляну ВСНГБ пацьверджана неабходнасьць пабудовы новых швэйных фабрык у Віцебску і Менску.

Фабрыка ў Віцебску праэктуецца на 1000 рабочых. „Витшвею" запрапанована прадставіць падрабязныя даныя адносна новай швэйнай фабрыкі.

Агульная колькасьць занятых рабочых з абслугоўваючым пэрсаналам на новай швэйнай фабрыцы ў Менску ўстаноўлена ў 500 чалавек.

Узьнята пытаньне перад прэзыдыумам ВСНГ БССР аб зацьверджаньні выдаткаў на пабудову швэйнай фабрыкі ў Менску замест 225000 руб., якія раней прадугледжваліся, арыентыравана ў 350000 руб.

Ня гледзячы на ўказаньні, „Миншвей" ня ўжыў належных мер да хутчэйшай пабудовы галянтарэйнай фабрыкі для выпрацоўкі палатняных гузікаў. Прамплян, у зьвязку з гэтым, запрапанаваў „Миншвею" адшукаць памяшканьне і заказаць абсталяваньне з тым, каб галянтарэйная фабрыка была пушчана ў ход у самы кароткі тэрмін.

У сувязі з ростам швэйнай прамысловасьці і невыстарчальным тэмпам рацыяналізатарскай работы, прызнана неабходным у самы кароткі тэрмін папоўніць новую фабрыку неабходнымі інжэнэрна-тэхнічнымі сіламі.

Бюро па справах швэйнай прамысловасьці пры ВСНГ даручана распрацаваць пэрспэктыўны пяцігадовы плян разьвіцьця швэйнай прамысловасьці, абрахаваўшы магчымасьць далучэньня да яе ў канцы сёлетняга апэрацыйнага году найбольш моцных працалекты ваў швэйнікаў, якія знаходзяцца ў акруговых цэнтрах.

Адначасова „Миншвею" і „Витшвею" запрапанована прысьпяшыць праэктоўку новых фабрык з тым, каб магчыма было сваячасова прыступіць да будаўніцтва. Пры складаньні гэтых праэктаў „Миншвею" і „Витшвею", запрапанована абрахаваць магчымасьць пашырэньня гэтых фабрык на 50 проц.

Вяляцкі старшыня.

Панкавец Мікола Вусьцінаў, старшыня сельсавету, як кажуць, чалавек з галавой і ў дадатак пісьменны.

Асобныя словы пісаць навучыўся яшчэ ў дарэвалюцыйнай школе — прыгожа расьпісваца,—а пры савецкай уладзе навучыўся складаць дзяўчатам даўжэрныя і атрутныя лісты.

Колькі ім складзена даўжэрных і атрутных лістоў дзяўчатам, — статыстыкай не падлічана. Тольні і відома, што гэтыя лісты складаліся самім старшынёй уласнаручна і пры тым на стале сельсавету, а сьпісы аб'ектаў абкладаньня на адзіны сельска-гаспадарчы падатак рабіліся, па даручэньню, выключаным камсамольцам Арцёмам Грукам на стале ў таго-ж Арцёма Грука і без усялякіх там запрашэньняў альбо абхоўў гаспадароў-платнікаў. За праўдзівасьць вестак Грук Арцём расьпісваўся сам і левай і правай, і рукой і нагой...

Вынікі ад такога «вучоту» ёсьць: сотні зоў на непраўдзівасьць вучоту і скрыганьне зубамі на зарасу ні ў чым не вінаватае савецкае ўлады...

Але ўсё гэта ня важна, як няважна і тое, што адзін ліст шаноўнага старшыні, вместа рук дзяўчыны, па надбайнасьці дзеловода, аддасьлашага яго разам з другой перапіскай у РВК, папаў у рукі старшыні Барысаўскага РВК т. Грышкевіча.

Якая была рэзалюцыя на тым лісьце, у вялікую гісторыю яшчэ не запісана. Можна дагадвацца, што ня ўсьлед думкам т. Панкаўца, а супроць іх, бо ён кінуў займацца «пісаньвем», а нажыў спэцадзеньне Адэскага заводу і пачаў рабіць візыты дзяўчатам.

Праўда, да мэты і візыты ў спэцадзеньні не прывялі—правалі хлопец, але... але, як адказны «савецкі» працаўнік на вёсцы, ён умела і сваячасова мяняе мэтад працы:

19 студзеня г. г. ён, надзеўшы „боты, галёшы і жупан", падыходзіць да дзяўчыны Сьцепаніды Максімавай.

— Так і так, душачка!.. Не магу жыць без цябе!.. Пойдзем у сельсавет запішамся!..

Дзяўчына ня верыць. Старшыня божыцца. Паверыла. Зайшлі...

Дастаў старшыня ведамасьць конскага вучоту, паклікаў сьведкамі двух камсамольцаў—Лясуна Алеся і Кобу Сяргея і ўрачыста зарэгістраваў свой шлюб з дзяўчынай Сьцепанідай—па ведамасьці конскага вучоту.

Апошнія дні з радасьці ён іржэ... І ясна, ня будзем-жа бляць баранам, запісаўшыся ў конскім вучоце!..

Самасей.

С. Вяляцічы, Барысаўскі райён.

Праца студэнтаў сярод чырвонаармейцаў.

(Б. Д. У.)

Адным з галін пазаеузаўскай грамадзкай працы студэнцтва БДУ зьяўляецца шэфства над часьцямі Чырвонай арміі. Гэты від грамадзкай працы цікавіць студэнтаў дзякуючы ня самастойнасьці—папершае, і падругое—дзякуючы добрым адносінам камандніка і палітычнага складу падшэфных часьцей.

Праца студэнтва, якая вядзецца па лініі кіраўніцтва чырвонаармейскімі гурткамі, мае ў гэтым годзе дасягненьні. Усяго працуе па кіраўніцтву гурткамі 83 студэнты. Усяго арганізава 56 гурткоў: агульнаадукацыйны, прыродазнаўства, грамадазнаўства, матэматычныя, па вывучэньні селар. мовы і інш. Заняткі праводзяцца кожны тыдзень.

Апрача гэтай працы, вядзецца яшчэ і праца з мэтай азнаямленьня студэнцтва з жыцьцём чырвонаармейцаў і наадварот—шляхам правядзеньня адпаведных экскурсій.

У будучыні неабходна павесьці працу сярод чырвонаармейцаў ня толькі з боку педагагічнага, але і ў іншых напрамках па спэцыяльнасьцях факультэтаў, набудаваўшы гурткі і куткі спэцыяльнага характару, дзе можна будзе падвядзіцца ведамі з тымі, хто ня меў яшчэ магчымасьці іх атрымаць.

П. Г.

Вывучаем свой край.

РАТУЙЦЕ БАБРОЎ!

У чэрвені 1927 году камісія Аршанскага АВК зафіксавала ў асобным акце прысутнасьць баброў на рацэ Проні (Дрыбінскі райён, вуг. Восава). Улетку 1926 году студэнт Беларускай Сельска Гаспадарчай Акадэміі тав. Шэдка бачыў каля вёскі Карабах дарослага бабра.

Ня гледзячы на гэта, ёсьць яшчэ асобы і нават установы, якія надаюць вельмі малое значэньне распаўсюджаньню баброў. Мэліярацыйныя таварыствы, спэцыялісты якіх прыдзелены да месца распаўсюджаньня баброў, ня лічаць даўсей справай і нават ігнорыруюць вышчэйшы гэту рэдкую каштоўную зьвярыну.

Супроць баброў выступаюць ня толькі несьвядомыя сяляне, а і людзі адукаваныя, якія павінны былі-б разумець усю важнасьць захаваньня бабровых заказьнікаў.

Так, культурніцкія Юроніц, які працаваў у гэтых таварыствах, афіцыйна надумаў пазбавіць ператі медыцынскім мэтам вадзе Аршанскага Акрэа аб спісаньні заказьнікаў у райёне гэтых таварыстваў.

Нашы навуковыя і дасьледчыя арганізацыі ня могуць прайсьці моўчкі каля гэтага пытаньня. Трэба ўзьняць голас супроць зьнішчэньня бабровых заказьнікаў у Дрыбінскім райёне.

АРГАНІЗАЦЫЯ КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЭЮ Ў ГОМЕЛІ.

Яшчэ ў пачатку мінулага году адміністрацыя Гомельскага адзяленьня дзяржаўнага музэю распачала арганізацыю пры музэі краязнаўчага аддзелу. У аснову гэтага аддзелу быў пакладзен дагістарычны краязнаўчы матар'ял (косткі маманта, тура, аленя і насарога, прадметы, атрыманыя шляхам раскопак і знаходак—акамянеласьці драўляна находжаньня) і ўзоры жалезнай балотнай руды і мінэралаў Гомельшчыны.

Краязнаўчы аддзел будзе складацца з 3-х аддзяленьняў: прамысловасьці і гандлю, сельска-гаспадарчага і грамадзка-бытовага.

Хроніка.

231.000 руб. дадаткова на земляўпарадкаваньне бядняцкіх гаспадарак.

У выкананьне маніфэсту юбілейнай сэсіі ЦВК СССР аб дадатковым асыгнаваньні сродкаў на правядзеньне земляўпарадкаваньня бядняцкіх сялянскіх гаспадарак—БССР атрымала 231 тысячу рублёў.

Грошы будуць разьмеркаваны па ўсіх акругах.

У прэзыдыуме менакрвыканкому.

ВЫТВОРЧЫ ПЛЯН ЗЕМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЯ НА 1927-28 ГОД.

Пры правядзеньні пляну земляўпарадкаваньня ў 1927-28 годзе па Менскай акрузе Прэзыдыум АВК запрапанаваў адпаведным органам кіраваца наступнымі прынцыпамі: мець на ўвазе павялічэньне ўдзельнай вагі калектыўных формаў землякарыстаньня, скарачаючы хутарскія і адрубныя формы. Апошнія дапускаецца ўжываць толькі тады, калі ажыцьцяўленьне калектыўнай формы зусім немагчыма.

Акруговаму вямельнаму аддзелу і райвыканкомам запрапанавана адпушчаць спэцыяльны фонд для земляўпарадкаваньня вёсак, у якіх зямлі няма, а земляўпарадкаваць іх трэба і карысна.

Плян працы зацьверджан з разрахункам выкарыстаньня за год 99 каморніцкіх адзінак (у 1926-27 г.—63 адзінкі). На гэту справу па дзяржаўным бюджэце адпусканца 185.756 руб і па сельска-гаспадарчым крэдыту—343.800 руб. За гэтыя сродкі маюць быць праведзены наступныя работы: земляўпарадкаваньне зімою на плошчы ў 22.526 гэктараў і летам—50.985 гэктараў (летась—усяго 35.749 гэкт.). Апрач гэтага, будзе праведзена землянадзяленьне ў летні порыад на плошчы ў 25.909 гэкт.

У пляне прадугледжана земляўпарадкаваньне мястэчак Капыля і Сьмілавіч і распрацоўка плану земляўпарадкаваньня дзяводнага Халопеніцкага райёну.

ПАЛЕПШАНЬНЕ АБСЛУГОЎВАНЬНЯ СЯЛЯНСТВА.

У зьвязку з тым, што газеты і райвыканкомы зьвяртаюць мала ўвагі на непасрэднае абслугоўваньне сялянства і на выдрашэньне на месцы пытаньняў, якія ўваходзяць у іх кампэтэнцыю, а таксама ў зьвязку з запазнным вырашэньнем скаргаў і заяў і фармалізм у высьвятленьні сутнасьці справы, прэзыдыум Менскага АВК пастанавіў:

Даручыць саветам і райвыканкомам пашырыць працу на прыёму скаргаў і арганізаваць прыём сялянства, якое прыходзіць у мясцовыя органы з розныемі заявамі. Наладзіць прыём заяваў і скаргаў у вышэйшыя ўстановы і своечасовае накіраваньне іх на прызначэньні в сваім заключэньнем.

Усе справы, якія ўваходзяць у кампэтэнцыю РВК, павінны абавязкова вырашацца на месцы. Члены гарсаветаў, што працуюць на прадпрыёмствах, павінны прымаць заявы і скаргі на месцы і накіроўваць іх на прызначэньні. Гэтае пытаньне Прэзыдыум АВК перадаў на абгаварэньне гарсаветаў і, у залежнасьці ад вынікаў, прапануе ажыцьцявіць яго.

Сьвяткаваньне Міжнароднага Жаночага Дню.

Урачыстыя сходы.

Учора ў рабочых клюбах і мясцкомах адбыліся ўрачыстыя сходы і вечары, прысьвечаныя Міжнароднаму Жаночаму Дню. На гэтых сходах ставіліся даклады аб міжнародным Жаночым Дні, а таксама адбыўся выпуск розных гурткоў.

Выстаўкі аб удзеле жанчын у савецкім будаўніцтве.

У Пушкінскай бібліятэцы і клюбе Карла Маркса адчыніліся выстаўкі, прысьвечаныя Міжнароднаму Жаночаму Дню.

Выстаўкі характарызуюць удзел жанчын у рэвалюцыйным руху, абароне краіны, арганізацыі новага быту і інш.

Награды жанчынам-актывісткам.

У часе сьвяткаваньня Міжнароднага Жаночага Дню на БССР будуць выдадзены награды жанчынам-актывісткам, сябрам ОСОАвіяхіму.

На ўрачыстых сходах апошнім будуць выдадзены граматы і значкі «актывіста».

Кольні жанчын—дэлегатак.

Да сёлетняга Міжнароднага Жаночага Дню ў БССР налічваецца 27980 дэлегатак, з іх 88 проц. дэлегатак-сялянак.

Чырвонаармейская газэта на беларускай мове.

Беларуская Аб'ядная Вайсковая Школа пачала выпускаць на беларускай мове (на шклопісе) адпатыднёвую газэту „Чырвоная Варта". Газета ўсебакова высьвятляе жыцьцё курсантаў.

18 месцаў на курортах для сялян Менскай акругі.

НК Аховы Здароўя адпусьціў для сялянства Менскай акругі 18 курортных месцаў у Крыме, Ліпецку і Старой-Русе. Месцы разьмяркованы па райёнах, дзе будзе рабіцца адбор для пасылкі на курорты.

Удзел ЦБ Крайзнаўства ў Лейпцыгскай школьнай выстаўцы.

ЦБ Краязнаўства паслала на інтэрнацыянальную школьную выстаўку СССР у Лейпцыг цэлы шэраг школьных экспанатаў па краязнаўству: дыяграмы, статуты, літаратуру і інш.

Экспорт шчаціны.

На днях акц. т-ва „Белшчаціна" адправіла ў Нямеччыну і Амэрыку партыю шчаціны на 110000 р.

У працягу II-га кварталу бягучага году „Белшчаціна" мае экспартаваць за межы на 400000 р. беларускай шчаціны.

110000 РУБ. НА МАШЫНЫ.

Белсэльбанк адпусьціў акругам 110000 руб. на крэдытаваньне сялянства па набыцьці сельска-гаспадарчых машын. Паміж іншым, адпушчана Бабруйску і Віцебску па 15000 р., Полацку і Мазыру па 10000 р., Магілеву 17500 руб. і Гомелю 12500 руб.

Тав. Хацкевіч вярнуўся ў Менск.

Учора вярнуўся ў Менск сэкратар ЦВК БССР тав. Хацкевіч, які езьдзіў у Маскву для дакладу ў Савеце Нацыянальнасьцяў аб правядзеньні нацыянальнай палітыкі ў БССР.

Прывітаньні ўраду БССР.

У дзень сьвяткаваньня 10-й гадавіны Чырвонай арміі на імя ўраду БССР паступілі прывітальныя тэлеграмы: ад № стралковага палка № стралковай Беларускай дывізіі і ад пленуму Горацкага гарадзкога савету.

Падрыхтоўка да міжнароднай выстаўкі друку ў Кёльне.

Учора пры Аддзеле Друку ЦК КПБ адбылася нарада, прысьвечаная падрыхтоўцы да міжнароднай выстаўкі друку ў Кёльне.

Усю падрыхтоўчую працу да гэтай выстаўкі праводзіць спэцыяльна ўтворная камісія.

Каб мець усе матар'ялы аб становішчы друку ў БССР, Аддзел Друку ЦК КПБ зьбірае весткі ад цэнтральных і акруговых газэт. Аддзел Друку ЦК таксама зьбірае расьцепныя газэты, якія атрымалі прэміі ва конкурсах.

Апрача гэтага, зьбіраюцца весткі аб тыражы газэт, аб сувязі газэт з масамі, аб рабселькораўскай дзейнасьці і інш. Усе гэтыя матар'ялы будуць накіраваны ў Маскву для ўключэньня ў агульную схэму становішча друку ў СССР.

Дапамога палітвязьням Заходняй Беларусі і Польшчы.

За месяц люты ў Менскі акруговы камітэт МОПР'у паступіла ад усіх райёнаў акругі 5150 р. Першымі па збору сродкаў на дапамогу палітвязьням Заходняй Беларусі і Польшчы ідуць Гаразкі, Ляхаўскі, Акцябрскі і Барысаўскі райёны.

300.000 п. вотрубей для БССР.

Нар. Кам. Гандлю СССР вызначыў для БССР на сакавік 300000 п. вотрубей. Гэта дасьць магчымасьць палкам забясьпечыць сялянскія гаспадаркі.

ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ.

СТАДЫЁН У МЕНСКУ ПАВІНЕН БЫЦЬ.

Набліжаецца летні спартыўны сэзон. Хутка гурткі выйдуць з памяшканьняў на паветра, на плянёўкі. Як заўсёды, колькасьць гурткоў к лету павялічыцца. Перашкодай у разьвіцьці фізкультурнай працы зьяўляецца адсутнасьць дастатковага ліку спартыўных пляновак [не гаворачы аб стадыёнах) амаль ва ўсіх гарадох БССР.

Асабліва адчуваецца адсутнасьць Цэнтральнага стадыёну ў Менску (плянёўка «Прафінтэрн» замалая каб вьмясьціць усе гурткі ФК).

Па пытаньні аб пабудове спартыўных пляцовак ужо ёсьць пастанова прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту, якая прапануе акруговым выканаўчым камітэтам „прадугледзець у пляне будаўніцтва пабудову спартыўных памяшканьняў і пляцовак, а Наркамзему і Менскаму Гарсавету разам з ФСФКБ у самы кароткі тэрмін распрацаваць пытаньне аб пабудоўцы ў Менску-Цэнтральнага Стадыёну дзеля масавых фізкультурных мерапрыёмстваў".

Дзеля гэтага намечан Менскі інадром.

Цэнер слова за Гарсаветам і Камхозам. Стадыён павінен быць у Менску і яго неадрыўлівасьцю чакаюць тысячы Менскіх фізкультурнікаў. На ім у гэтым-жа годзе павінна прайсьці Ўсебеларуская летняя спартакіяда—агляд фізкультурных дасягненьняў беларускіх фізкультурнікаў.

ТУРЫЗМ НА БЕЛАРУСІ.

Лета 1927 году паказала, што турызм заняў ужо месца сярод беларускіх фізкультурнікаў і зьяўляецца вельмі даступным спортам для ўсіх.

Зараз ВСФКБ складаецца спэцыяльная камісія дзеля апрацоўкі мерапрыёмстваў з мэтай папулярызацыі на Беларусі турызму.

Цяжкія часы.

Аслабанілася пасада бібліятэкара ў клюбе савгандльслужачых, які зрабіў заяўку на Біржу Працы. Біржа пасылае беспрацоўную бібліятэкаршу О... з сэкцыі Працасьветы, даюць ёй пуцёўку, а тая, ня ведаючы на якім яна сьвеце (больш за год часу беспрацоўная), куляю прыляцела ў клюб савгандльслужачых.

А там, мусіць, самы адказны і самы разумны працаўнік, па пасадзе, як мне казалі, загадчык клюбу, павёў такую прамову, трымаючы ў рудэ пуцёўку Біржы.

—Гм... навошта нам з саюзу працасьветы, ці-ж бібліятэкары ёсьць выключна ў саюзе працасьветы, а мо мы жадаем узяць бібліятэкара з саюзу нарчарчаваньня, ці з саюзу хатніх працаўніц, а потым мы вас не прасілі і не выклікалі, мы прасілі нам прысылаць т. Х... яна куды больш знаёма са справаю і наогул... яна больш..., ды што тут гаманіць.

Мы будзем яшчэ весьці перамовы з Біржай, а вы зайдзіце, калі хочаце, пасьля заўтра ў гэту пару. Бывайце здаровы.

Радасьць О... (якая, як бібліятэкар, працавала на пасадзе бібліятэкара 6 г.) адразу згінула, стала ёй вельмі сумна. Ідучы назад ужо памаленечку, яна ціха прагаварыла:—«Эх, насталі-ж цяжкія часы, проста хоць з мосту да ў воду».

А ці не магчыма было-б такіх працаўнікоў, як з клюбу савгандльслужачых, заклікаць да парадку.

Можа гэта хто і зробіць, пачакаем.

Ляшчынскі.

Спэкулянт Рысін перад судом.

За кітайскай сьцяной.

Суду даюць паказаньні адказныя працаўнікі МЦРК т. т. Зынгерман, Гравіт, Вольфсон і іншыя. Усе гэтыя паказаньні сьведчаць аб тым, што праўленьне МЦРК амаль ня было ўцягнута ў штодзённае дзелавое жыцьцё раўных працаўнікоў ЦРК. Да гэтага часу праўленьне ня ведае добра характарыстыкі кожнага працаўніка і нават ня ведае, хто з іх раней быў гандляром, а гэта, па сьцьвярджэньні самога старшыні праўленьня т. Зынгермана, мае вялікае значэньне, мае вялікі ўплыў у справе ўтварэньня прападзольнага і сумленнага апарату. На падбор працаўнікоў у савецкую каапэрацыю трэба было зьвярнуць асаблівую ўвагу, бо маты, якія ставяць сабе савецкая каапэрацыя ў галіне абслугоўваньня працоўных мас, дыямэтральна працівалеглы мэтам ня толькі гандляра, але нават былога гандляра, ня гледзячы на яго позуны вывеску.

Вось гэта ня дабяйства і вячулаць можна ўбачыць з „праверкі" сумленнасьці Рысіна. Тав. Зыльберквэйт заявіла члену праўленьня МЦРК тав. Вольфсону, што Рысін перадае галёшы. Што-ж робіць Вольфсон? Выклікае загадчыка крамы і... апавядае яму аб усім, што сказала тав. Зыльберквэйт. Ці можна гэткім чынам праверыць сумленнасьць Рысіна?—Зразумела, не.

Ніхто з членаў праўленьня ня можа сабе ўяміць, чаму ўтварыліся дрэнныя адносіны паміж камсамольцам Ліўшыцам і спэкулянтам Рысінам.

— Раз Ліўшыц сварыцца з Рысіным,—значыць, трэба іх разлучыць, і зноў наступіць мір,—разважае тав. Вольфсон, а каб прыглядзецца глыбей да гэтай справы, каб разабрацца, што тут справа не ў асабістых сымпатыях, а што Рысін проста не падходзіць да працы ў савецкай каапэрацыі—ніхто да гэтага не дадумаўся.

Гэта вера ў людзей даходзіла да такіх абсурдаў у працаўнікоў праўленьня МЦРК, калі нават падпімалася пытаньне аб сьпісаньні з Рысіна... яго растраты.

Рысін робіць закупку ў прыватнікаў, але ніхто за гэтым не сачыць; ніхто ня цікавіцца, ці правільна вызначаюцца цэны на тавар. Толькі адночы выпадкова тав. Вольфсон застаў прыватніка пры здачы тавару Рысіну і, вусім ня будучы сэкцам у гэтай галіне, толькі патаргаваўся, і прыватнік панізіў цану на пару туфель з 9 да 8 руб.

А хто можа гарантаваць, што Рысін пры яго „сумленнасьці" кожны раз ня браў процантаў з прыватніка, вызначаючы за гэта высокія цэны на тавары?

Што слухаць па радыё.

Пятніца, 9-III.

6—00—6—30 Гутарка 7-я на прыродазнаўству на тэму: «Касмічная роля расьлін».
6—30—7—10 Беларуская радыё-газэта № 44.
7—10—7—40 Гутарка аграномаў на тэму: 1) Сартавое насьнье і ўраджай. 2) Арганізацыя сялянскай жывёлагадоўлі.
7—40—8—10 «Беларуская вёска» па радыё.
8—10—10 Канцэрт.

Субота, 10-III.

6—00—6—30 «Беларускі піанэр» па радыё.
6—30—7—10 Беларуская радыё-газэта № 45 (з польскім аддзелам).
7—10—7—40. Даклад на тэму: «Задачы каапэрацыі ў зьвязку з рашэньнем 15 парт. зьезду».
7—40—8—10 Гутарка ТСА-Авіяхіму на тэму: «Аб 2-й авіяцыйнай лётарэі».
8—10—10 Канцэрт.

АДДЗЕЛ „ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА АСЬВЕТНІКА" ВЫЙДЗЕ Ў ЧАРГОВЫМ НУМАРЫ.

БІБЛІАГРАФІЯ.

В. Сіцынскі. Хаткі і танны выраб пладовых він. З цыклю «Сялянская бібліятэка», кн. № 81. Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва. Менск—1928. Стар. 53. Ц. 30 кап.

Беларусь мае досыць многа садоў. У Случчыне, Барысаўшчыне, Бабруйшчыне, Віцебшчыне, Аршаншчыне, Магілеўшчыне і Гомельшчыне можна спаткаць досыць часта, што ў сялянскіх і мяшчанскіх гаспадарках пад садам знаходзіцца 1—3 і больш дзесяцін зямлі. Сады гэтыя ў некаторай толькі сваёй частцы засаджаны доўгатрывалымі сартамі фруктаў. Большасьць-жа—летнія сарты, якія хутка псуюцца. Такія сады даюць вельмі малы даход, бо прыходзіцца збываць тавар як мага хутчэй і таму за бясцэнак. Ды нават і зімовыя сарты, як антонаўкі і інш., часам няма куды збыць, ці прыходзіцца аддаваць розным спэкулянтам на вельмі таннай цане.

Дзякуючы гэтаму, нашы садаводы жаляцца на дрэнныя ўмовы садоўніцтва. Кніжка В. Сіцынскага прыходзіць на помач такім гаспадарам. Яна рэкамандуе вырабляць з пладоў віна, што вусім магчыма і хатнім спосабам. Як вынікае з кніжкі, выраб такіх він ня толькі з садовых пладоў, а і наогул з розных садовых і дзікіх ягад вусім просты. У кніжцы дан цэлы шэраг малюнкаў вусім простых прылад, якія можна ў кожнай гаспадарцы самаму зрабіць, і тлумачэньняў да іх. Прыведзен таксама і цэлы шэраг тлумачэньняў і рэцэптаў, як вырабляць віна з вішань, чарэшань, сьлівы, парэчак, агрэсту, маліны, ожаўны, ляснуніцы, клубнікі, чарніцы, яблык, рабіны, ігруш і равеню.

Як аказваецца, ня толькі садавод, а і ўсякі грамадзянін у сваім доме мае поўную магчымасьць прыгатаваць для свайго дамовага ўжытку добрага фруктовага віна, якое пры належным уходзе вічым ня ўступае дарагім крамным віноградным вінам. Садаводы-ж, якія-б заняліся масавым выробам фруктовага віна, магчы-б мець вельмі добры з гэтага прыбытак.

Мэтаю кніжкі і зьяўляецца дапамагчы нашаму садаводу выкарыстаць свой садовы ўраджай як найкарысьней для сябе. Ды і кожнаму несадаводу яна дае магчымасьць прыгатаваць для сябе фруктовае віно.

Выданьне кніжкі трэба вітаць, тым больш, што ў продажы да апошняй пары падобных кніжак ня было.

Яшчэ было-б лепей, каб у кніжцы былі тлумачэньні і рэцэпты аб тым, як сушыць розныя фрукты. У гэтай галіне ў нас няма літаратуры.

П. Т.

КІНО.

„Парижский сапожник".

У аснову сцэнарыя Н. Нікіціна і Б. Левавідава ўзяты дакументы з быту камсамолу. Пасьля, на матэрыяле Н. Нікіціна напісаў аповесьць: «Преступление Кирика Руденко».

Перш за ўсё, у гэтым «Сапожніке» нічагусенькі «парыскага» няма і невядомо, чаму аўтары рашылі назваць яго парыскім. Назва не адпавядае зьместу і дадзена, як відаць, дзеля таго, каб атрымаць большую выручку. Але гэта бяда невялікая.

Паставіўшы перад сабой заданьне даць мастацкую сапраўднасьць з жыцьця нашага камсамолу, аўтары фільму «Парижский сапожник» з гэтым заданьнем справіліся вельмі здавальняюча. Калі ня лічыць некаторых нязначных недахопаў чыста тэхнічнага парадку, дык фільм вельмі добры.

Тэма новая і цікавая. Фільм зроблен з густам. У маладым рэжысэры Эрмлеры камсамол мае добрага мастака і ўдумчывага работніка, які вырашае пытаньне проста і зразумела. Ніхто не вінават, што ў камсамоле ёсьць балячкі. З гэтымі балячкамі Эрмлер няшчадна змагаецца.

Лепей было-б, каб у фільме ня так моцна было падкрэслена «чорт возьми, любовь к девочкам и к международному масштабу», папойкі, картачныя гульні, нітымныя інтрыгі і распуста, якая ўрэшце завяршаецца разбоем. Гэта, менавіта, не сапраўднасьць з жыцьця камсамолу.

Роля Монькі Тундаля мала зразумела. Ніхто ня ведае, чаму ён увесь час стараецца скамарамэтаваць камсамольцу Каню, хочучы, побач з гэтым, дапамагчы камсамольцу Андрою.

Пераглядаючы фільм, мы натыкаемся на навіну ў кіно-мове. Мы бачым надпісы: „в доску парень, стирить, кармать" і інш. заладзейскія тэрміны. Гэта таксама не камсамольская сапраўднасьць, і калі яна ў асобных выпадках ёсьць, дык з бо неабходна змагацца, а не рэкламаваць яе.

Ігра маладога калектыву артыстаў вельмі добрая. Асабліва гэта адчуваецца ў ролі Кірыка. Жаночыя ролі выкананы слабей.

Фатаграфія наогул, і асабліва ў некаторых мясцох, вельмі цікавая: у ёй адчуваецца рука вопытнага работніка.

С. Аз.

Завочныя курсы кіно-сцэнарыстаў.

Ва ўмовах культурнага і гаспадарчага росту савецкіх рэспублік кіно, як адно з наймагутнейшых сродкаў палітычнага выхаваньня і культурнага ўздыму мас, набывае—з прычыны свайй даступнасьці і шырокай распаўсюджанасьці—выключнае значэньне.

Асабліва вялікая і адказная задача ўскладаецца на кіно ў справе асьветы нашай вёскі. Нажаль, на рэгулярным разьвіцьці вясковай кіно-сеткі, дасягнуўшым ужо ў БССР пэўных вынікаў, моцна адбіваецца цэлы шэраг аб'ектыўных перашкод. Асабліва дае сябе адчуваць востры недахоп у добрых савецкіх карцінах, ідэалёгічна вытрыманых, мастацкі-каштоўных і разам з тым зразумелых і цікавых для гледача. Гэткую карціну можна стварыць толькі пры наліччы добрага, адпавядаючага ўсім гэтым патрабаваньням сцэнарыя. Гэтых сцэнарыяў пакуль што мы ня маем. Адным з сродкаў да ліквідацыі сцэнарнага крызісу могуць быць Курсы Завочнага Навучаньня, адчыненыя ў Маскве Цэнтральным Саветам Таварыства Прыхільнікаў Савецкага Кіно. Курсы гэтыя, заснаваныя пры матар'яльным падтрыманьні Белдзяржкіно, складаюцца з двух аддзяленьняў: 1) сцэнарнага і 2) аддзяленьня кіно-мэханікаў і кіно-арганізатараў для вёскі. Нас больш цікавіць першае аддзяленьне, бо пэўны кадр мэханікаў Белдзяржкіно пакуль мае. Курсы дадуць магчымасьць кожнаму жадаючаму навучыцца ў цікавячай яго галіне і пры тым у сябе ў хаце шляхам бязупынай і пісьмовай сувязі з курсамі Сцэнарнае аддзяленьне падрыхтоўвае сцэнарыстаў, дае ім фактычныя і тэарэтычныя ўказаньні па складаньні сцэнарыяў, Лепшыя сцэнарыі вучняў, напісаныя ў працэсе вучэбнай працы, будуць рэкамандаваны кіно-арганізацыям для пастаноўкі. Праходжэньне курсаў сцэнарнага аддзяленьня разьлічана на 8 месяцаў. За гэты час вучням будуць пасланы 32 друкаваныя лекцыі. У кожным аддзяленьні маецца педагагічны савет, складзены з лепшых спэцыялістаў гэтых галін кіно-справы. Педагагічны савет вядзе ўсю перапіску з вучнямі: адказвае на ўсе запытаньні, дае вадачы, правярае іх разьвязваньне і праводзіць экзамен. Скончыўшаму курсы і добра вытрымаўшаму экзамен будзе выдадзена адпаведнае пасьведчаньне.

На шматлікія запытаньні мы паведамляем аб умовах паступленьня:

Слухачамі курсаў могуць быць усе грамадзяне ад 15 год, умеючыя чытаць, пісаць, ведаючыя 4 дзеі арыфметыкі і вядомыя з дробамі. Для паступленьня на курсы трэба падаць анкеты і заяву па вызначанай форме, якія высылаюцца па першаму запатрабаваньню за 8 кап. марку. Для паступаючых ва сцэнарнае аддзяленьне неабходна апроч таго прадстаўць кароткі жыцьцяпіс. Усе спраўкі і пэрапіску накіроўваць па адрасу: Москва, 9, Тверская, 35. Заочные курсы пры ЦС ОДСК. Плата за ўвесь курс 15 руб. Для членаў